Пралетары ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 30 (444) | Серада, 23 жніўня 1939 года | Цана 20 кап.

АБ РАБОЦЕ З МАЛАДЫМІ ПІСЬМЕННІКАМІ

Нядаўна адбылося сумеснае пасяджэнне бюро ЦК ВЛКСМ і прэзідыума Саюза совецкіх пісьменнікаў. На пасяджэнні абмяркоўвалася пытанне аб рабоце з маладымі пісьменнікамі.

У прынятай па гэтаму пытанню пастанове указваецца, што работа па выхаванню маладых пісьменнікаў адстае ад патрабаванняў, якія прад'яўляюцца нашай краінай к совецкай літаратуры.

Карэнным недахопам работы з маладымі аўтарамі з'яўляецца адсутнасць пастаянных клопатаў аб іх ідэйна-палітычным выхаванні, аб узбраенні іх рэвалюцыйнай тэорыяй, аб дапамозе ім у самастойным вывучэнні «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Іменна гэтым, указвае пастанова, тлумачацца ў першую чаргу факты нізкай ідэйнай якасці творчай работы, факты зазнайства, нецярпімых адносін да крытыкі паасобных пісьменнікаў, выпадкі маральна-бытавога разлажэння і іншыя нездаровыя з'явішчы, маючыя іншы раз месца ў асяроддзі пісьменнікаў.

Сярод часткі маладых пісьменнікаў дагэтуль не зжыты шкодныя настроі, якія выражаюцца ў тым, нібыта пісьменнікам можна стаць без сур'ёзнай, сістэматычнай работы па ўзняццю свайго агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню.

Нярэдка маладыя аўтары бяруцца за літаратуру як адзіную сваю прафесію, не маючы для гэтага дастатковай агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі і дастатковага жыццёвага вопыту. Гэтыя заўчасна прафесіяналізіруючыяся маладыя пісьменнікі часта адыходзяць ад вялікіх тэм нашага соцыялістычнага жыцця і, з другога боку, іншы раз прыкрываюць так званай «актуальнасцю» тэмы ідэйнае і мастацкае ўбоства сваіх твораў.

Пастанова таксама адзначае, што ў многіх журналах і выдавецтвах работа з маладымі аўтарамі вядзецца дрэнна. Замест сур'ёзнай штодзённай работы, якая павінна развіваць у іх уменне і густ да самастойнай работы, іншы раз спяшаюцца апублікаваць няспелыя вопыты і празмерна захвальваюць, альбо агульна ахайваюць маладых пісьменнікаў.

У кіраўніцтве многіх літаратурных гурткоў, літаб'яднанняў і кансультацый стаяць безграматныя людзі, якія прыносяць вялікую шкоду справе выхавання маладых пісьменнікаў. Кіраўнікі літаратурных кансультацый часта забываюць, што ў справе выхавання маладых аўтараў патрэбен сугуба індывідуальны падыход, улік творчых асаблівасцей кожнага пісьменніка.

Для больш шпаркай ліквідацыі недахопаў у рабоце з маладымі пісьменнікамі пастанова абавязвае гаркомы, абкомы і ЦК ЛКСМ саюзных рэспублік сумесна з праўленнямі і бюро Саюза совецкіх пісьменнікаў у рэспубліках і абласцях звярнуць галоўную ўвагу на ідэйна-палітычную работу з літаратурнай зменай, на аказанне ёй дапамогі ў вывучэнні гісторыі ВКП(б), у авалоданні марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Для павышэння агульнакультурнага росту маладых літаратараў прапануецца праводзіць для іх лекцыі і даклады па пытаннях сучаснай навукі, гісторыі і тэорыі літаратуры, мовазнаўства і інш. Пры гэтым звярнуць асаблівую ўвагу на неабходнасць пастаяннай работы па авалоданню багаццем роднай мовы, і асабліва рускай мовы, якая з'яўляецца галоўным сродкам культурнага ўзаемадачынення народаў СССР і далучэння іх к сусветнай культуры.

Пастанова ўказвае, што праўленню ССП неабходна безадкладна прыступіць да стварэння прац і складання зборнікаў артыкулаў па пытаннях тэорыі літаратуры, мовы, паэзіі, драмы і прозы на аснове вучэння Маркса—Энгельса—Леніна — Сталіна аб мастацтве.

Пастанова рэзка асуджае маючыяся факты скажэння параграфа 2-га Статута ССП, калі ў члены ССП прымаюць людзей, нічога агульнага не маючых са званнем пісьменніка, а ў паасобных выпадках не дапускаюць у саюз дастойных, таленавітых таварышоў.

У пастанове чотка і па-новаму вызначаны характар і змест работы літаб'яднанняў і літгурткоў. Літаратурныя аб'яднанні павінны стварацца толькі пры рэдакцыях літаратурна-мастацкіх журналаў і газет. Да кіраўніцтва гэтымі аб'яднаннямі трэба прыцягнуць буйнейшыя літаратурныя сілы. Адказнасць за работу аб'яднанняў павінна ляжаць на рэдактарах і рэдкалегіях газет і журналаў. Літаратурныя гурткі пры заводах, калгасах, установах павінны з'яўляцца адным з відаў масавай самадзейнасці. І толькі тыя з членаў літгурткоў, якія творча праявілі сябе ў літаратуры, будуць уцягвацца ў літаратурныя аб'яднанні пры журналах і газетах.

Пастанова ўказвае на неабходнасць умацавання літкансультацый. Для гэтага трэба перагледзець склад работнікаў кансультацый, прыцягнуць для работы ў іх кваліфіцыраваных пісьменнікаў, крытыкаў і выкладчыкаў літаратуры.

Для дапамогі маладым пісьменнікам літаратурныя арганізацыі павінны перыядычна наладжваць абмеркаванне творчасці паасобных пісьменнікаў з прыцягненнем майстроў літатуры, а ў журналах і газетах друкаваць крытычныя артыкулы аб творах маладых аўтараў.

Журнал «Литературная учеба» выраша[illegible] перабудаваць такім чынам, каб у асно[illegible] яго работы была пакладзена канкрэт[illegible] дапамога літаратурнай моладзі.

[illegible] [illegible]цыйнай калегіі «Комсомольской [illegible] а таксама краявым, абласным [illegible] [illegible]анскім комсамольскім газетам [illegible] выпускаць «Літаратурную [illegible] [illegible]е радзей аднаго разу ў [illegible] [illegible]итературная газета»).

Сустракванне Ўсесаюзнага дня авіяцыі ў Маскве. Таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Жданаў, Мікаян, Берыя, Швернік, Вышынскі, Будзённы, Кулік, Лакціёнаў, Шчэрбакоў, Бадаеў, Міхайлаў і іншыя на трыбуне аэрадрома ў Тушыно.

Фотахроніка ТАСС.

Барыс Макарцэў.

ЗАЦЯЖНЫ

(НАРЫС)

САМАЛЁТ гатоў к вылету. Лётчык-высотнік Корэў прыбавіў газу і мы, скародзячы зямлю кастылём і падымаючы клубы пылу, шпарка парулілі к вызначанаму ў цэнтры аэрадрома старту. Тэхнік не суправаджаў нас. У блакітным бязвоблачным небе ўсё вышэй падымалася ласкавае сонца. Здалёку віднеўся ў дымцы горад. Зялёным абрусам пасціляўся наперадзе аэрадром, акантаваны сілуэтамі цяжкіх і лёгкіх самалётаў. З другога боку, на фоне крылатага будынка грамадзянскага аэравакзала, блішчэлі, як срэбраныя, трохматорныя самалёты і, вылучаючыся над імі, стаяў чырвонакрылы гігант.

Корэў збавіў газ і, спыняючы машыну, паказаў рукою назад. Я агляну́ўся. К старту, пабліскваючы на сонцы фарамі, набліжаліся два аўтамабілі.

— Гэта камандуючы Ваенна-Паветранымі сіламі, — крыкнуў Корэў.

Яго меркаванне спраўдзілася. З першай машыны, якая спынілася недалёка ад самалёта, выйшаў камандуючы. Яго стройная фігура шпарка набліжалася. Я хацеў вылезці з машыны і далажыць, але мяне папярэдзіў роўны і спакойны голас:

— Не вылазьце... Спадзяюся, таварыш Орлоў, што вы, ужо зарэкамендаваўшы сябе парашутыст, бліскуча выканаеце пастаўленую вам цяжкую задачу рэкорднага зацяжнога прыжка... Жадаю вам поўнага поспеху...

Я пацісну́ў працягнутую мне руку і адказаў: «Ёсць, таварыш камандуючы... будзе выканана...» На мяне добра, пабацькоўску глядзелі прыгожыя вочы камандуючага, і той-жа голас роўна і спакойна далаў:

— Можаце вылятаць...

Поўны газ. Гулка заспяваў матор, мільгнула зямля—і наша аднакрылая птушка рванулася ў блакітную вышыню. Унізе паплылі квітучыя палі, лясныя масівы, блакітныя істужкі звілістых рэчак, роўныя квадраты дамоў, сіметрычныя паркі сталіцы. Роўна, чотка работае матор, стрэлка высотамера шпарка адлічвае: 500, 1000, 1500...

Самалёт шпарка набірае вышыню, ідучы па шырокай спіралі. Загадкава блішчыць крыло пад сонечнымі промнямі. Мы цяпер толькі ўдваіх, але мы не адарваны ад жывога свету. Там, унізе, я адрозніваю яшчэ групку людзей, якія засталіся на старце.

Лётчык аглядваецца. Я гляджу ў яго блакітныя, як неба, вочы і бачу праз акуляры, як яны ўсміхаюцца, бачу, як палец, абцягнуты фетрам пальчаткі, тыкае ў лічыльнік абаротаў і пасля паказвае ў неба. І зноў усміхаюцца вочы. Мне ўсё зразумела, я ведаю, чаму радуецца лётчык. Ён радуецца, што наш самалёт так шпарка набірае вышыню, што матор так чыста, так бесперабойна работае. Я веру ў совецкі матор, я веру ў лётчыка Корэва. Прыўзняўшыся, я хлопаю яго па плячу і на маўклівым паветраным жаргоне гавару:

— Эх, і машынка... хараство!..

Ён разумее гэта і стараецца даказаць, што машына іменна такая: кідае руль упраўлення, самалёт устойліва ідзе па прамой, не звальваючыся на крыло і не трапячы хуткасці. Крычаць нячутна, але зразумелы яго губы: «Бачыў... на вялікі...» Мы абодва смяемся і радуемся, як дзеці, забыўшыся на час аб усім.

Але ўнізе чакаюць людзі, яны спадзяюцца на нашу перамогу.

Зноў ручка, газ і пілот, спалучаючыся разам, нагнаюць лічбы на цыферблаце маленькага прыбора. Гэты прыбор пакажа мяжу, на якой чалавек з непрыкметнага, звычайнага можа вырасці ў героя, а, магчыма, і ў сусветную вядомасць. На вышыні 3.800 мы бачым усё, як на далоні: раскінуліся лабірынты маскоўскіх вуліц, змяіцца рака Масква і тонкім павуціннем разыходзяцца вакол чыгуначныя дарогі і шасе.

Адчуваю, што становіцца цяжка дыхаць, і пачынаю завіхацца ля кіслароднага апарата. Паяўляюцца воблакі і шпарка распаўзаюцца белымі баранчыкамі па блакітнаму полю. Нястомна і роўна спявае матор, рэзка вылучаецца ўпартая патыліца лётчыка, і машына, упіраючыся бліскучым крылом у празрыстае паветра, свідруе сінеючую далячынь.

Павольна, але няспынна пасоўваецца маленькая стрэлка. Неба над намі цямнее і робіцца сінім. Мы ідзём усё вышэй і вышэй, чакаючы моманту, калі маленькі прыборчык пакажа лічбу «11». Радзей блішчаць роўныя зубы, радзей у люстэрку ўсміхаюцца блакітныя вочы, мацней упілася рука лётчыка ў ручку ўпраўлення і роўны гул пявучага матора робіцца злавесным і чужым. Лётчык высмоктвае дадатковы кісларод з балона. Бесперапынна сціскае ў скронях, вяла варушацца мыслі і цяжкія павекі стараюцца прыкрыць стомленыя ад напружання вочы. Здаецца, прыклеілася стрэлка да лічбы «10» і не хоча рухацца далей. Але не здаецца ўпартая патыліца, пасунулася стрэлка з зачараванай лічбы і павалі папаўзла па дробных дзяленнях прыбора. Сілай непахіснай веры чалавек настойліва ідзе да перамогі. Упіліся стомленыя вочы ў разбухшыя дзве палачкі — лічбу «11». Я цьмяна бачу, як яшчэ раз глядзяць на мяне вочы лётчыка. «Пара...» — уклінsocket ваецца ў шум прыглушанага матора голас.

Шпарка заварушыліся працвярожаныя мыслі, але яны бягуць уразброд, ствараючы цэлы рад вобразаў. Я чамусьці ўспамінаю маленства, старую маці, прыяцеляў, знаёмых дзяўчат. Я чую, як гучна стукае сэрца.

Шукаю кіслародны прыбор. Нечаканым рыўком хваста лётчык напамінае аб сваёй нецярплівасці. На мяне глядзяць уже не блакітныя, а сталёвыя, загадваючыя вочы. Гэтыя вочы надаюць мне сілу волі, я адчуваю прыліў энергіі. Чотка працуюць мозгавы і нервовы цэнтры. Шпарка пераключаюся на кіслародны прыбор, адсоўваю назад сядзенне і выцягнуўшы засцерагальнік, бяруся за ручку аўтаматычнага люка.

Я падымаю руку ў знак гатоўнасці. Ківо́ком галавы падбадзёрвае мяне лётчык. Энергічны рывок за ручку—і я правальваюся ў бяздонне. Рассякаючы паветра, лячу ўніз галавой на шэрую планету, як-бы намерваючыся прабіць яе сваім целам наскрозь. Ніякага страху я не адчуваю, зрэдку паглядваю на секундамер і секунды мне здаюцца гадзінамі, днямі, вечнасцю.

Пачынаю прыстасоўвацца да становішча чалавека, які ляціць у прасторы. Адчуваю боль у вушных перапонках і ведаю, што трэба спяваць, — а што спяваць?.. І вось мозгавы цэнтр, на момант забываючыся на парашутнае кольца, якое я павінен своечасова выцягнуць, усю сваю сілу сканцэнтроўвае на выбары песні, якую я павінен зараз заспяваць. Вушныя-ж перапонкі не чакаюць, яны гатовы лопнуць, яны сваім болем прымушаюць мяне крычаць што папала. Я крычу нешта бязглуздае, і мне робіцца смешна, і я смяюся гучна, рагачу, як звар'яцелы, ураўнаважваючы ціск на вушныя перапонкі.

На твары я адчуваю вільгаць, — відавочна трапіў на воблака. Вось яны, гэтыя белыя, прыгожыя баранчыкі, якія бягуць па блакітнаму полю неба! Як прыкра адчуваць іх вільгаць і імглу, закрываючую зямлю. Але вось і зямля — яна ўсміхаецца мне ясна бачнымі каляровымі квадратамі, зялёнымі кляксамі, блакітнымі змейкамі... Я толькі зараз заўважыў, што сонца зусім побач, яно вітае мяне сваімі цёплымі промнямі. Гэта жыццё — кіпучае, прыгожае. Яно цягнецца сваімі цудоўнымі рукамі да мяне, яно вабіць, спакушае, усміхаецца...

Але раптам я адчуваю, што страціў зямлю. Мая рука, падпарадкоўваючыся інстынкту, нервова шукае кольца парашута. Халодны пот выступае на скронях, я канвульсіўна, усім целам імкнуся перавярнуцца, каб убачыць зямлю. Гэта смерць. Гэта яна напамінае аб сабе, гэта яна цягнецца да мяне сваімі касцістымі рукамі...

На зямлі стаяць яны, мае таварышы, яны працягваюць да мяне рукі і разам са мною адлічваюць невялічкія секунды. Але я ведаю, што буду жыць... Я павінен жыць... Я павінен перамагчы дзеля сваёй радзімы...

Зямля ашалела ляціць на мяне. Роўныя квадраты расплываюцца ў бясформенныя плямы. Я ўжо трымаюся за кольца парашута, баюся страціць зямлю. Пада мною расце зялёная клякса, мусіць лес. Відавочна, я падаю недзе па-за горадам. Я моцна рву за кольца і адчуваю, што страшным рыўком мяне падкінула ўверх. У вачах паявіліся вясёлкавыя кругі, моцна ные ў правым плячы і галава, здаецца, хоча трэснуць ад болю.

Але вось я пачынаю адрозніваць навакольныя прадметы. Сонейка пяшчотна заглядвае пад вялікі белы купал парашута, на якім я плаўна спускаюся на вясёлую квітучую планету. А дзе-ж воблакі-баранчыкі?.. Чаму неба зноў такое блакітнае, прыгожае? Так, гэта жыццё, гэта тая планета, на якой я жыву...

Пада мною лес і рака. Баючыся трапіць у ваду, я пачынаю планіраваць і, шпарка трацячы вышыню, удала прызямляюся на ўскраі лесу. Парашут, карыстаючыся поўным штылем, накрывае мяне сваім купалам. Я адчуваю прыемнае лятыканне шоўку і мне не хочацца ўставаць, мне так добра ляжаць на сакавітай траве і адчуваць скрозь шоўк пяшчоты сонца. Я не ведаю, дзе знаходжуся, але гэта не важна: я-ж перамог, я шчаслівы за сваю радзіму!

Выступленне мастацкай самадзейнасці БССР на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве

НЕВЫЧАРПАЛЬНЫЯ НАРОДНЫЯ ТАЛЕНТЫ

Паказу беларускай калгаснай мастацкай самадзейнасці на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы папярэднічала доўгая паездка па раёнах. Апрача пастаноўшчыка, ездзіла брыгада па адбору лепшых самадзейных сіл. Адабрана было хоць і многа, але далёка не ўсё. Незлічоны багацці і вялікая рознастайнасць талентаў у БССР! Можна было-б стварыць некалькі зусім розных, вялікіх па колькасці і аднолькава выдатных па якасці груп удзельнікаў самадзейнасці калгасаў, соўгасаў і МТС.

Добрае афармленне мастака Ц. Я. Кіпніса, паэтычная музыка выступленняў і патрыятычнага фінала, напісаная беларускім кампазітарам Е. К. Цікоцкім, тэксты К. Крапівы, яго вершы і песні,— усё гэта спрыяла паказу, дапаўняла і ўпрыгожвала яго. Нельга не адзначыць добрай работы па збіранню унікальных касцюмаў работніка Дома народнай творчасці М. К. Пачэкінай, якая добра ведае народны беларускі касцюм і арнамент.

А выканаўцы? Што гэта за людзі, якімі так захаплялася Масква? Хто гэтыя выдатныя артысты? Гэта звычайныя калгаснікі. Людзі ад трактара, камбайна, ад ураджайных калгасных палёў.

У пачатку, калі работа яшчэ толькі намячалася, пастаноўшчык быў у роспачы—думаў, нічога не выйдзе. Гэта-ж нявопытныя людзі! Можа, лепш выпусціць іх у звычайным канцэрце? Але гэтыя, не спакушаныя сцэнай, простыя калгаснікі са здзіўляючым разуменнем схаплівалі тэкст, будавалі складанейшыя жывыя мізансцэны, групіраваліся, запаміналі месцы, ігралі, як вопытныя артысты. Работа была складанай і стамляючай, але ніхто не хацеў адпачываць. Амаль пасля кожнай рэпетыцыі чуліся просьбы: «Давайце паўторым яшчэ раз!».

У Маскве—цёплая сяброўская сустрэча на вакзале. Размясціліся недалёка ад выстаўкі, у Трыфанаўскім гаражу. За час прабывання ў Маскве беларускія калектывы самадзейнасці два разы выступалі ў Зялёным тэатры Цэнтральнага парка культуры і адпачынку імя Горкага, два разы ў Тэатры народнай творчасці па радыё, чатыры разы — з велізарным поспехам—на тэрыторыі выстаўкі і перад тэлевізарам. Многія песні запісаны на грампласцінкі.

Сярод удзельнікаў выступленняў — калектывы Хойніцкай МТС і калгаса «Перамога соцыялізма» пад кіраўніцтвам Левінкага і Гофмана. Калектыў самадзейнасці МТС паказваў свайго непераймальнага «Юрачку» і спяваў песню «Сталіну дзякуй усюды гучыць». Вядомы калгасны хор Рэчыцкага раёна на чале з Т. К. Лапацінай выканаў песні «Як крыніца цячэ», «Жартаўлівыя частушкі» і іншыя. Юравіцкі хор прыехаў з народнай папулярнай песняй «Лён». Калгаснікі з Асіпавіцкага раёна танцавалі старажытныя танцы «Мікіта» і «Шостак» і паказалі масквічам вясёлую гульню «Казлы». Усе выступленні суправаджаліся аркестрам народных інструментаў гор. Дзяржынска.

Рад плясак аб'яднаных калектываў быў удала скамбініраван загадчыкам харэаграфічнай часткі выступлення І. Н. Ліневічам. Памылкова пісаў у сваім артыкуле ў «Советском искусстве» тав. Івінг, што танцы пастаўлены. Магчыма, што гэта прыкрая апіска: у самадзейных калектывах Беларусі, дзе не было ніводнага прафесіянала, ніхто не адважыўся-б «ставіць» народныя танцы. Такіх танцаў, якія былі выкананы беларусамі на выстаўцы, не паставіць ні аднаму балетмейстру!

У праграму аб'яднанага хора, які складаўся з усіх удзельнікаў, уваходзілі, апрача папулярнай песні «Камар», абаронная песня і «Песня аб таварышу Сталіне» (дзве апошнія напісаны спецыяльна для выступленняў кампазітарам Е. К. Цікоцкім), таксама песня, запісаная беларускім кампазітарам І. Любанам,—«Ой, у лузе, лузе» і вядомая ўсяму Саюзу песня Любана на тэкст Русака «Бывайце здаровы, жывіце багата». Гэта песня карысталася выключным поспехам. Яна настолькі моцна ўвайшла ў быт, што без яе выступленне беларусаў было-б, здаецца, няпоўным.

Трэба адзначыць дасканалую работу М. І. Нікалаевіча, які развучыў увесь песенны матэрыял з харамі, прымаўшымі ўдзел у маскоўскім выступленні. Сярод удзельнікаў вылучаўся тав. Жэмчак, які па-майстэрску чытаў уступны верш і фінальны маналог. Наогул уся размоўная частка, якая апрацоўвалася Д. Ф. Жукавым, гучала і выглядала добра.

БССР напярэдадні дэкады. Выступленне калгаснай самадзейнасці на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы — уступленне да гэтай дэкады. Калі збіральнікам народных шэдэўраў і талентаў у даным выпадку з'яўляўся Дом народнай творчасці, дык цяпер такім збіральнікам будзе Дзяржаўная філармонія, якой даручан заключны канцэрт дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Калі выступленне на Сельскагаспадарчай выстаўцы прайшло добра, то заключны канцэрт павінен прайсці выдатна. Дзяржаўная філармонія, якая цяпер ужо валодае добрымі выканаўцамі, павінна сабраць для свайго паказу ўсё самае лепшае.

Касьян ГАЛЕЙЗОЎСКІ.

Пастаноўшчык выступлення, рэжысёр.

ПРЫГОЖА І ВОЛЬНА ГУЧАЛІ ПЕСНІ

Мяняецца жыццё, мяняецца і песня. На змену сумным, прыгонніцкім, прыйшлі новыя, бадзёрыя, жыццёрадасныя, шчаслівыя калгасныя песні. У іх народ выказвае свае адносіны да жыцця і працы, услаўляе сваіх мудрых правадыроў Леніна і Сталіна, якія вывелі працоўных з беднасці і цемры на шырокі шлях, шчодра заліты сонцам, і вядуць іх у светлую будучыню — комунізм.

Усё гэта яшчэ раз стала відавочным для ўсіх, хто меў шчасце бачыць і слухаць выступленні беларускіх калектываў самадзейнасці на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Вось стары калгаснік расказвае абступіўшым яго дзецям казку «Чалавек-сонца». Дзеці ўважліва, зачаравана слухаюць, бо яны любяць героя гэтай казкі — В. І. Леніна і вучацца па яго запаветах будаваць комуністычнае грамадства. Стары скончыў казку, і дзеці, радасныя за тое, што чалавек-сонца і іх бацькі перамаглі ворагаў, пускаюцца разам з дарослымі ў скокі.

Колькі радасці, жвавасці, пачуцця ўкладваюць выканаўцы ў беларускі народны танец «Крыжачок»!

Багата нацыянальнымі танцамі Беларусь! Хто здолее стаяць спакойным, калі перад ім у імклівым тэмпе выконваецца «Лявоніха»? Такіх на выстаўцы не было. Натоўп хваляваўся, апладыраваў, шумна выказваў сваё захапленне. Не меншае ўздзейнічанне на прысутных аказалі і другія выдатна выкананыя беларускія народныя танцы, як «Юрачка», «Мікіта», «Мяцеліца». Цудоўнае відовішча было, калі выконваўся поўны задору народны танец працы «Лянок». Усе здзіўлена глядзелі і прыгадвалі працэсы вырошчвання і апрацоўкі ільну.

Прыгожа і вольна гучалі песні! Хор Хойніцкай МТС па-майстэрску выканаў беларускую народную песню «Сталіну дзякуй усюды гучыць». З вялікай цеплынёй былі прыняты прысутнымі беларускія народныя песні «Ой, зелена, зелена», «Лён», «Вярба», жартаўлівая песня «Камар». У іх з усёй паўнатою ўсталі перад масквічамі і прадстаўнікамі братніх рэспублік мудрасць, дасціпнасць і аптымізм беларускага народа.

Беларускі народ шчасліва працуе, радасна спявае, але ні на гадзіну не забывае таго, што ён жыве на граніцы. У любую хвіліну ён гатоў у дружбе з усім многанацыянальным совецкім народам не толькі абараняцца, але ўшчэнт разбіць ворага на той тэрыторыі, адкуль ён прыйдзе. У часе танцаў раптам раздаецца сігнал трывогі. Баявая песня-кліч узлятае ў паветра. Узброеныя першакласнай тэхнікай, на чале са слаўным палкаводцам, саратнікам Сталіна, таварышам Варашылавым патрыёты радзімы канчаткова знішчаюць ворага і зноў пачынаюць сваю мірную працу.

Зацвілі сады. Людзі зажылі яшчэ шчаслівей, часцей сталі ездзіць у госці, часцей сталі спяваць сваю любімую песню «Бывайце здаровы!»

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці БССР адчувалі сябе ў Маскве, як у сваім родным доме. Тысячы людзей страсна рукапляскалі ім, запрашалі да сябе ў госці. Натхнёныя дружбай і любоўю масквічоў, украінцаў, грузінаў, яны спявалі, танцавалі, ігралі з вялікім тэмпераментам і задорам. Беларускія матывы бадзёра і звонка гучалі над выстаўкай, крылата луналі над Масквой, палонячы сэрцы сваім хараством.

Многа ўражанняў засталося ў нас, слухачоў курсаў маладых літаратараў, ад выстаўкі, і вельмі прыемнае ўражанне пакінула ў нас выступленне беларускай мастацкай самадзейнасці на выстаўцы.

М. ТКАЧОЎ.

Сход гурткоў мастацкай самадзейнасці

21 жніўня адбыўся сход удзельнікаў мастацкай самадзейнасці калгасаў, соўгасаў і МТС, якія выступалі ў Маскве на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

На сходзе прысутнічалі сакратар ЦК КП(б)Б тав. Малін, старшыня СНК БССР тав. Кісялёў, начальнік Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР тав. Озірскі, дырэктар Дома народнай творчасці тав. Рубенчык, кампазітары, рэжысёры і прадстаўнікі друку.

У сваёй прамове тав. Озірскі падвёў вынікі праробленай гурткамі мастацкай самадзейнасці работы і ад імя ўрада БССР падзякаваў за добры паказ сваіх дасягненняў у Маскве.

Вельмі цёпла сустрэлі прысутныя выступіўшага з цікавай і змястоўнай прамовай тав. Кісялёва. Тав. Кісялёў заклікаў удзельнікаў мастацкай самадзейнасці настойліва вучыцца, павышаць свой культурна-палітычны ўзровень. І калі тав. Кісялёў у заключэнне сваёй прамовы назваў імя таварыша Сталіна, усе прысутныя наладзілі бурную авацыю ў гонар вялікага правадыра народаў.

Ад імя ўдзельнікаў калектываў мастацкай самадзейнасці выступіў тэхнік соўгаса «Новыя Зялёнкі» Чэрвеньскага раёна тав. Жэнчак.

У заключэнне ўсімі ўдзельнікамі сходу з вялікім уздымам была выканана песня «Падзяка Сталіну» і любімая народная беларуская песня «Бывайце здаровы!»

КОНКУРС НА АДНААКТНУЮ П'ЕСУ ДЛЯ САМАДЗЕЙНЫХ ТЭАТРАЎ

Па рашэнню Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР і ВЦСПС, выдавецтва «Искусство» сумесна з Домам народнай творчасці імя Крупскай і Домам мастацкай самадзейнасці ВЦСПС праводзяць конкурс на аднаактную п'есу для самадзейнага тэатра.

Саюз совецкіх пісьменнікаў СССР звярнуўся да ўсіх членаў саюза і ў першую чаргу да драматургаў з заклікам прыняць удзел у конкурсе.

Улічваючы велізарнае значэнне якасці рэпертуару ў справе далейшага развіцця мастацкай самадзейнасці, якая налічвае сто тысяч драмгурткоў і паўтара мільёна ўдзельнікаў, Саюз совецкіх пісьменнікаў заклікаў драматургаў і пісьменнікаў прыняць актыўны ўдзел у стварэнні палітычна актуальных, мастацка-поўнацэнных аднаактных п'ес, даступных для пастаноўкі ўсёй масе самадзейных тэатральных калектываў.

Узорна падрыхтавацца да дэкады ў Маскве

ЗА КУЛЬТУРУ АКТОРСКАГА МАЙСТЭРСТВА

Наш супрацоўнік меў гутарку з рэжысёрам МХАТ прафесарам-ордэнаносцам І. М. Раеўскім, які кансультуе спектаклі, рыхтуемыя Мінскім Дзяржаўным беларускім драмтэатрам да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

— У лютым гэтага года, — заявіў тав. Раеўскі, — я атрымаў запрашэнне прыняць удзел у падрыхтоўцы спектакляў, якія прызначаны для паказу ў часе дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Яшчэ ў свой першы прыезд я пазнаёміўся з двума пастаноўкамі Белдрамтэатра — «Апошнія» і «Пагібель воўка». Тады-ж я зразумеў, што пытанне аб кансультацыі трэба ставіць шырэй. Справа ў тым, што ў актораў, пры ўсіх іх здольнасцях, не было адзінага творчага метада работы над роляю. У тэатры можна было сустрэць прадстаўнікоў розных школ акторскага выхавання. Зразумела, што ўстала задача ў першую чаргу аб'яднаць калектыў на адзіным метадзе.

У сучасны момант калектыў ажыццяўляе, — праўда, не для ўсіх лёгкі, — працэс унясення карэктываў у творчасць актора над роляю.

У гэтым сэнсе хочацца адзначыць сапраўды вялікае жаданне ўсіх работнікаў тэатра працаваць прапанаваным мною метадам, што з'яўляецца надзвычай каштоўным.

Не гледзячы на свой вялікі вопыт, многія акторы са здавальненнем развітваюцца са старымі традыцыямі, паводле якіх яны працавалі на працягу многіх год, і страсна, па-маладому бяруцца за ўсё жывое, што нясе новы метад работы.

Гэта сведчыць аб тым, што калектыў Беларускага драмтэатра—жывы арганізм, які не заспакойваецца на тым, што мае, а са здавальненнем убірае ў сябе ўсё новае, жывое, што дае магчымасць узняць культуру акторскага майстэрства.

Над чым працуе зараз тэатр? Нанава перапрацоўваецца да дэкады спектакль «Партызаны» Крапівы, дапрацоўваецца «Пагібель воўка» Самуйлёнка, «Апошнія» Горкага і ставіцца камедыя Крапівы «Хто смяецца апошнім».

Гэтыя п'есы могуць надзвычай разнастайна прадэманстрыраваць дасягненні драматычнага мастацтва ў БССР. Акторам гэтыя п'есы даюць магчымасць ярка выразіць свае індывідуальнасці, бо ў кожнай з пералічаных п'ес ёсць усе элементы ўвасаблення вобразаў і характараў, паводле якіх можна меркаваць аб якасцях акторскага майстэрства.

І. М. Раеўскі.

Яшчэ рана гаварыць, вядома, аб тым, якімі будуць спектаклі. Папярэдне яны павінны атрымаць ацэнку беларускай грамадскасці і ўрадавай камісіі. Але калектыў тэатра разумее ўсю адказнасць, якая стаіць перад ім, і вельмі ўпарта працуе над адшліфоўкай кожнай дэталі спектакля для таго, каб дастойна прадэманстрыраваць сваё мастацтва ў Маскве.

УЗНАЧАЛІЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ДЭКАДЫ

21 жніўня ва Упраўленні па справах мастацтваў пры СНК БССР адбыўся сход партыйнай арганізацыі, прысвечаны падрыхтоўцы да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. З дакладам аб ходзе падрыхтоўкі выступіў начальнік Упраўлення тав. Одрскі.

Падрыхтоўка да дэкады праходзіць у атмасферы велізарнай увагі, клопатаў і вялікай дапамогі партыі і ўрада. Асігнаваны значныя грашовыя сродкі, задаволены ўсе заяўкі тэатраў на матэрыялы. Створаны ўсе прадпасылкі для паспяховай падрыхтоўкі да дэкады.

Аднак, у падрыхтоўцы да дэкады надзяляецца яшчэ рад буйных недахопаў У тэатрах няма таго творчага напружання, якое павінна характарызаваць падрыхтоўку важнейшай палітычнай падзеі ў гісторыі беларускага мастацтва.

У Тэатры оперы і балета яшчэ шмат арганізацыйных непаладкаў, няма ўвязкі ў рабоце цэхаў, не ўмацавана пастановачная частка, нават эксплаатацыя новага будынка тэатра тут яшчэ не асвоена. Падрыхтоўка балета «Салавей» не ўзнята на адпаведную вышыню: артысты балета дагэтуль не бачылі яшчэ эскізаў касцюмаў, у якіх яны будуць выступаць. А касцюмы-ж вызначаюць не толькі эпоху, а ў значнай меры і вобразы.

Марудна разгортваецца падрыхтоўка да дэкады ў Філармоніі. Дагэтуль не ўкамплектаваны склад брыгады мастакоў, якая зоймецца афармленнем канцэрта.

Асабліва востра стаіць пытанне аб рабоце апарата Упраўлення па справах мастацтваў. Ва Упраўленні за апошні час наглядаецца нейкая самазаспакоенасць. Тэатральны і музычныя сектары аслабілі работу, недастаткова звязаны з нізавымі арганізацыямі. Работнікі тэатральнага сектара рэдка бываюць на рэпетыцыях у калектывах, не цікавяцца дробязямі, ад якіх часта залежыць поспех падрыхтоўкі да дэкады. Дрэнна пастаўлена праверка выканання. Падрыхтоўка конкурса на лепшага выканаўцу, які павінен адыграць значную ролю ў адборы лепшых выканаўчых сіл для дэкады, праходзіць вельмі вяла.

Фонды матэрыялаў атрыманы, але да тэатраў яшчэ не давезены. У Тэатры оперы і балета ёсць яшчэ шмат будаўнічых недаробак.

Спрэчкі па дакладу тав. Одрскага былі параўнальна бледныя і насілі характар агульных разважанняў. Выступаўшыя згаджаліся з тым, што недахопаў у падрыхтоўцы да дэкады многа, але мала хто ўносіў канкрэтныя прапановы па ліквідацыі гэтых недахопаў. Была ўнесена, напрыклад, такая «новая» прапанова — арганізаваць ва Упраўленні сектар праверкі выканання. Расказвалі аб паперцы, якая па волі кіраўніка спраў доўга блукала з Упраўлення ў Паркамасветы і назад і нiяк не знаходзіла адрасата. Гаварылася аб тым што кожнае мерапрыемства трэба падагульваць і г. д. Гэта сведчыць аб тым, што сход не быў дастаткова падрыхтаван для абмеркавання пытання аб дэкадзе. Таму партыйны сход, які павінен быў выявіць карэнныя недахопы падрыхтоўкі да дэкады і дабіцца значнага зруху ў гэтай падрыхтоўцы, звёўся, галоўным чынам, да канстатацыі фактаў і да добрых пажаданняў.

Партыйная арганізацыя Упраўлення павінна шчыльна заняцца падрыхтоўкай да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, арганізаваўшы ў першую чаргу праверку таго, як члены партыі, што працуюць у апараце Упраўлення, выконваюць свае прамыя абавязкі, як яны ўзначальваюць даручаныя ім участкі работы і як канкрэтна ажыццяўляюць указанні ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

РОСТ ТВОРЧАЙ АКТЫЎНАСЦІ

29 жніўня пастаноўкаю п'есы «Пагібель воўка» заўчасна памёршага беларускага пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка пачынае асенне-зімовы сезон Мінскі Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр.

Спектакль гэты, пастаўлены рэжысёрам К. Н. Саннікавым, будзе паказан на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Кансультуе спектакль рэжысёр МХАТ імя Горкага прафесар-ордэнаносец І. М. Раеўскі. Актыўны творчы ўдзел у рабоце тэатра гэтага заслужанага майстра сцэны спрыяе павышэнню культуры спектакляў, рыхтуемых да дэкады. Больш прадуманай становіцца агульная лінія пастановак, глыбей раскрываецца аўтарскі замысел, лепш распрацоўваюцца рэжысёрскія і акторскія задачы, рашуча выганяецца штамп, найгрыш, пустата. У спектаклях зараз адчуваецца адзінства стылю акторскага выканання, ансамблевасць. Дзякуючы вопытнай рэжысёрскай рабоце тав. Раеўскага, многія выканаўцы па-новаму раскрыліся ў пастаноўках.

Работа тав. Раеўскага ў нашым тэатры —адзін з яскравых прыкладаў той вялікай культурнай дапамогі, якую рускі народ аказвае братняй Беларусі.

Тав. Раеўскі кансультуе не толькі «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка, ён кансультуе таксама спектаклі: «Партызаны» Кандрата Крапівы (пастаноўка засл. арт. БССР Л. Г. Рахленка, рэжысёр К. Н. Саннікаў), «Апошнія» М. Горкага (пастаноўка засл. арт. БССР М. А. Зорава) і ставіць новы спектакль—камедыю К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» (рэжысёр Л. Г. Рахленка).

Усе спектаклі, вызначаныя для паказу на дэкадзе, пойдуць у новым мастацкім афармленні, з новымі выканаўцамі ў некаторых ролях. Напрыклад, у спектаклі «Партызаны» К. Крапівы Данілу Дрыля іграе народны артыст БССР В. Уладамірскі, пана Яндрыхоўскага — засл. арт. БССР С. Бірыла, пані Яндрыхоўскую — заслужаныя артысткі БССР Л. Ржэцкая і О. Галіна, ксяндза — засл. арт. БССР Г. Грыгоніс.

Па лініі мастацкага афармлення спектакляў вялікую работу праводзіць запрошаная з Масквы мастак-кансультант Е. А. Боркіна.

Падрыхтоўка да дэкады павысіла творчую актыўнасць усяго калектыва тэатра. Вядома, не ўсё яшчэ як след арганізавана —і ў сэнсе загрузкі ўсіх працаўнікоў тэатра работай, і ў сэнсе рацыянальнага скарыстання рэпетыцыйнага часу, разгорту творчай вучобы; але тая выключная адданасць справе, дысцыпліна, якія ўжо ёсць у наяўнасці, сведчаць аб тым, што калектыў разумее адказнасць свайго выступлення ў Маскве. Калектыў разумее, што дэкада беларускага мастацтва ў Маскве не ёсць простая дэманстрацыя чарговых дасягненняў тэатра, а што гэта вялікі паварот у яго жыцці і дзейнасці, экзамен на яго мастацкую сталасць.

Падагуліўшы свой дваццацігадовы шлях, Дзяржаўны Беларускі драматычны тэатр рушыць да новых творчых вышынь, да больш складаных ва ўсіх адносінах пастановак, якімі з'явяцца яго чарговыя спектаклі — трагедыя В. Шэкспіра «Рамео і Джульета» і «Рэвізор» Н. Гогаля. Падрыхтоўка да дэкады, такім чынам, з'яўляецца адначасова і падрыхтоўкай пастаноўкі на беларускай сцэне выдатных твораў сусветнай драматургіі.

Акторскі калектыў, група старых майстроў, якія прайшлі з тэатрам увесь яго творчы шлях, і таленавітая моладзь, якая папаўняе тэатр, — асноўнае багацце, якое любоўна беражэ Мінскі Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр.

Вывучаючы і пераймаючы багаты вопыт вялікага рускага мастацтва, наш тэатр здолее больш выразна акрэсліць свой творчы профіль, дабіцца адзінства творчых прынцыпаў у мастацкім кіраўніцтве і смела стаць на шлях пошукаў свайго арыгінальнага стылю і сцэнічнай выразнасці.

Удзел у дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве і 20-гадовы юбілей тэатра, які прыпадае на 14 верасня 1940 года, — гэтыя дзве падзеі мабілізуюць усю ўвагу калектыва, выклікаюць у ім вялікую творчую актыўнасць. З такім настроем пачынае асенне-зімовы сезон Мінскі Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр.

Апрача вышэйпамянёных спектакляў, у гэтым сезоне пойдуць: «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча, «Салавей» Зм. Бядулі, «Скупы» Мальера, «Ваўкі і авечкі» і «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага, «Непакойная старасць» Л. Рахманава, «Падзь Сярэбраная» Н. Пагодзіна і інш.

З радам беларускіх драматургаў вядуцца перагаворы аб уключэнні ў рэпертуар іх новых твораў. У рэпертуар наступнага года будуць уключаны таксама дзве лепшыя п'есы савецкіх драматургаў братніх літаратур і адна п'еса заходне-еўрапейскага аўтара.

Сіламі маладых актораў тэатра мяркуецца стварыць вучэбны спектакль.

Е. РАМАНОВІЧ.

На Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. Ля павільёна Грузінскай ССР.

Фотахроніка ТАСС.

Ісак Ізраілевіч Бродскі

Смерць вырвала з нашых радоў аднаго з таленавіцейшых і выдатнейшых дзеячоў выяўленчага мастацтва — Ісака Ізраілевіча Бродскага.

З першых крокаў сваёй творчай работы, яшчэ будучы вучнем Акадэміі мастацтваў, ён звярнуў на сябе ўвагу мастацкай грамадскасці. Яго класныя рысункі служылі тэмаю пастаянных спрэчак і гутарак сярод вучняў акадэміі.

Пазней, на вясенняй выстаўцы, яго карціна «Чырвонае пахаванне» правісела вельмі надоўга і была знята царскай цэнзурай. Гэта карціна прымусіла грамадскасць загаварыць аб І. І. Бродскім, як аб буйным мастаку.

Конкурсная карціна, якая паказвае дзяцей, гуляючых у Летнім садзе, служыла прадметам вялікіх спрэчак. У ёй было штосьці новае, што выходзіла па-за межы звычайнага. У той час гарачым абаронцам Ісака Ізраілевіча быў Ілья Ефімавіч Рэпін, у майстэрні якога працаваў І. І. Бродскі. Як чалавек, што вылучаўся сваёй таленавітасцю, І. І. Бродскі быў прынят у Рэпіна ў яго Пенатах, часта бываў у яго, а іншы раз падоўгу гасцяваў там, працуючы ў Рэпіна.

У сучасных спрэчках аб мастацтве здараецца часам чуць думку, што ў работах І. І. Бродскага мала жывапісных вартасцей. Гэта няпраўда. І. І. Бродскі быў бліскучым жывапісцам. Аб гэтым сведчыць рад яго выдатных работ, што маюць надзвычай вялікія жывапісныя якасці. Пачынаючы з партрэта жонкі, які быў выстаўлен ім на акадэмічнай выстаўцы ў год сканчэння акадэміі, і канчаючы вялікімі палотнамі пазнейшых часоў. І. І. Бродскі заўсёды быў майстрам жывапісу.

Надзвычай тонкія па каларыту іспанскія эцюды, глыбока лірычныя пейзажы, зробленыя ювелірнай тэхнікай сведчаць аб ім, як аб вялікім майстру жывапісу інтымнага жанру.

Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя дала І. І. Бродскаму новы змест для яго твораў. Мастак робіць велізарны крок наперад — ад індывідуальнай і інтымнай да грамадскай і гістарычнай тэматыкі.

І. І. Бродскі быў першым, хто ўзяўся за савецкі гістарычны жывапіс. Яго карціна «Пасяджэнне Камуністычнага Інтэрнацыянала» раскрыла ў ім зусім новую якасць, — якасць гістарычнага мастака. Відавочна, што для гэтага патрэбны былі і зусім іншыя жывапісныя якасці. І ён іх паказаў.

Іншы раз мы крытыкавалі творчасць І. І. Бродскага, крытыкуем і цяпер. І правільна робім, таму што мы жадаем савецкаму мастацтву непарыўнага развіцця. Савецкая грамадскасць прад'яўляе ўсё большыя і большыя патрабаванні к мастацтву, і інакш не можа быць. Мы павінны бязмежна расці. Але якія-б патрабаванні ні прад'яўляліся к мастацтву, справядлівасць патрабуе прызнаць, што І. І. Бродскі быў асновапаложнікам савецкага гістарычнага жывапісу.

Валодаючы велізарным тэхнічным дараваннем, будучы выдатным арганізатарам, ён стварае рад каласальных гістарычных палотнаў: «Расстрэл бакінскіх камісараў», «Ленін на Пуцілаўскім заводзе», «Ленін праводзіць Чырвоную Армію на польскі фронт» і г. д. Пералічыць партрэты правадыроў і выдатных дзеячоў Савецкага Саюза проста няма магчымасці. Партрэтаў правадыра народаў таварыша Сталіна напісана І. І. Бродскім некалькі дзесяткаў.

Работы І. І. Бродскага праз Дзяржаўнае выдавецтва выяўленчага мастацтва распаўсюджваюцца па ўсяму неабдымнаму Савецкаму Саюзу. Варта адзначыць, што ў Доме ўрада БССР, у малай зале пасяджэнняў, ёсць дзве выдатныя работы І. І. Бродскага — партрэты правадыроў народаў В. І. Леніна і І. В. Сталіна.

У час, калі ржаўчына фармалізма перашкаджала нармальнаму росту савецкага мастацтва, работы І. І. Бродскага, вядомыя па рэпрадукцыях, служылі вялікай справе барацьбы за сацыялістычны рэалізм, супроць фармалізма.

Простая, сумленная, можна сказаць — чысцейшая форма яго твораў заўсёды была зразумелай і даходчывай шырокім масам працоўных.

Партыя і савецкі ўрад высока ацанілі работу І. І. Бродскага, узнагародзіўшы яго ордэнам Леніна і званнем заслужанага дзеяча мастацтваў СССР.

Талент вялікага мастака рэдка спалучаўся так удала з талентам грамадскага дзеяча і педагога, як гэта было ў І. І. Бродскага.

У 1933 годзе партыя і ўрад аказалі І. І. Бродскаму вялікае давер'е, усклаўшы на яго абавязкі прэзідэнта Ленінградскай акадэміі мастацтваў. І. І. Бродскі бліскуча праводзіць рэарганізацыю акадэміі, якую ледзь не прывялі да развалу шкоднікі, ворагі народа з трацкісцка-бухарынскага лагера.

Адбыўшаяся ў чэрвені гэтага года абарона дыпломных работ студэнтамі Акадэміі мастацтваў паказала вялікі рост ідэйнага зместу і прафесіянальнай тэхнікі выхаванцаў акадэміі. І. І. Бродскаму, дзякуючы яго арганізатарскаму таленту, удалося прыцягнуць у акадэмію лепшых мастакоў-рэалістаў, мастакоў-выкладчыкаў.

Будучы паслядоўным і вытрыманым рэалістам, І. І. Бродскі ў сваіх работах вылучаўся сярод іншых мастакоў адной вельмі цікавай рысай — шырынёй погляду, уменнем адрозніваць сапраўдны рэалістычны напрамак у творы ад знадворнага ўражання.

Гэта асабліва ярка выявілася на работах вучняў акадэміі, якія закончылі свае работы па майстэрні самога Ісака Ізраілевіча. Кожны з вучняў меў свой індывідуальны твар і характар. Нават не верылася, што гэта вучні адной і той-жа майстэрні, — да такой ступені адсутнічаў штамп, які звычайна накладваўся майстрам (амаль непазбежнае зло) на сваіх вучняў.

Сярод карцін вучняў І. І. Бродскага ёсць літаральна выдатныя творы, пад якімі не сорам было-б падпісацца любому спеламу савецкаму майстру. Заслугоўваюць асаблівай пахвалы работы Белаусава: «Ленін і Сталін на кватэры рабочага перад Кастрычнікам», Козела: «Калінін у гасцях у землякоў-калгаснікаў», Капейкіна: «Дзіцячы сад у калгасе», Строгая: «Смерць Пушкіна», Рабышэва: «Чырвонагвардзейцы ў Леніна ў Смольным».

Але як ні разнастайны па манеры, па падыходу к тэме работы яго вучняў, усім ім уласціва веданне рысунка, імкненне да рэалістычнай закончанай формы, да праўдзівага жывапісу.

Ісак Ізраілевіч памёр у поўным росквіце сваёй творчасці. Смерць заўчасна вырвала з нашых радоў выдатнага майстра, вялікага грамадскага дзеяча-педагога. Цяжкая страта для савецкага мастацтва!

Для нас-жа, хто асабіста ведаў Ісака Ізраілевіча, у яго асобе страчан абаяльны, адзыўчывы і чулы таварыш.

На ўцеху нам застаецца толькі адно: усё тое, чаму ён аддаў усё сваё жыццё, усе свае сілы, было вялікай, сапраўды савецкай справай, якая ніколі не памрэ, як не памруць яго работы і не знікне з гісторыі развіцця савецкага мастацтва імя Ісака Ізраілевіча Бродскага.

М. КЕРЗІН.

Засл. дзеяч мастацтваў БССР.

Л. БАРАГ

Аляксандр Одоеўскі

27 жніўня мінае сто год з дня смерці выдатнага паэта-дзекабрыста А. І. Одоеўскага. Зведаўшы заключэнне ў Петрапаўлаўскай крэпасці і дванаццаць год сібірскай катаргі і ссылкі, Одоеўскі па «міласціваму» ўказанню цара быў назначан радавым салдатам у дзеючую Каўказскую армію, дзе загінуў ад трапічнай ліхаманкі. Духоўнае аблічча гэтага таленавітага паэта і летуценніка, загубленага нікалаеўскай рэакцыяй, цудоўна перадаў Лермантаў у вядомым вершы, прачытаным ім у 1839 годзе на вечары, прысвечаным памяці Одоеўскага, у кругу прыяцеляў дзекабрыстаў:

Он был рожден для них, для тех надежд,
Поэзии и счастья... но, безумный —
Из детских рано вырвался одежд
И сердце бросил в море жизни шумной,
И свет не пощадил — и бог не спас!
Но до конца, среди волнений трудных,
В толпе людской и средь пустынь
безлюдных
В нем тихий пламень не угас:
Он сохранил и блеск лазурных глаз,
И звонкий детский смех и речь живую,
И веру гордую в людей и жизнь иную.

Аляксандр Одоеўскі не належаў да натхніцеляў руху 14-га снежня, хаця, як гаварылася ў абвінаваўчым заключэнні следчай камісіі па справе дзекабрыстаў, «прымаў удзел у замысле і асабіста дзейнічаў у мяцяжы з пісталетам у руцэ». Арыстакрат-«рурыкавіч» па паходжанню і выхаванню, бліскучы коннагвардзейскі афіцэр і ў той-жа час паклоннік заходніх асветнікаў, прыяцель дэмакрата Рылеева і энтузіяст па натуры, ён займаў у Паўночным тайным таварыстве дзекабрыстаў невыразныя, хісткія пазіцыі паміж групай ліберальных арыстакратаў і радыкальнай групай Рылеева. Але, кінуты ў вадаварот рэвалюцыйных падзей, рамантычна настроены Одоеўскі назаўсёды звязаў свой лёс з пацярпеўшым паражэнне рухам дзекабрыстаў і стаў перакананым барацьбітом за ідэалы 14-га снежня.

Мяркуючы па дайшоўшай да нас нязначнай частцы вершаў Одоеўскага, напісаных у першай палове 20-х гадоў, яго творчасць амаль не выходзіла за рамкі салоннай паэзіі таго часу. Фарміраванне Одоеўскага як палітычнага паэта адносіцца, відавочна, к 1825—1827 годам, калі ім быў напісан прасякнуты нянавісцю да «вялікага свету» верш «Бал» і не дайшоўшы да нас нелегальны верш «Безжизненный град», знойдзены пры арышце ў дзекабрыста С. П. Трубецкога. Сярод турэмных вершаў Одоеўскага 1826 года, адзначаных характэрнымі настроямі роспачы, мы знаходзім выдатны верш «Сон паэта», у якім паэт з гордасцю гаворыць аб сваіх грамадзянскіх пачуццях і дзейнасці.

Дзекабрыст М. А. Бестужаў лічыў час, праведзены дзекабрыстамі на катарзе, «самай квітучай эпохай вершаў, аповесцей, апавяданняў і мемуараў». Сапраўды, прабыванне на катарзе ў асяроддзі іншых асуджаных дзекабрыстаў мела свой дадатны ўплыў на ідэйна-мастацкі рост Одоеўскага. Іменна тут, у Сібіры, Одоеўскі вырас у сапраўднага песняра дзекабрыстаў і буйнага майстра верша. Ён выступаў не як паэт якой-небудзь вузка-класавай групкі ўнутры дзекабрысцкага руху, але з'явіўся выразіцелем высокіх дум і імкненняў, характэрных для ўдзельнікаў разгромленага руху ў цэлым. «Галоўны наш паэт» — называе Одоеўскага ў сваіх «Запісках» дзекабрыст Н. І. Лорэр. Другі дзекабрыст-катаржанін Н. В. Басаргін гаворыць аб вершах Одоеўскага гэтага перыяду, як аб «гучных і цудоўных вершах, якія адносяцца да нашага становішча, згодны з нашымі думкамі, з нашай любоўю да бацькаўшчыны».

Ужо ў першы год свайго прабывання на катарзе (1827 год) Одоеўскі піша славуты «Ответ» на вершы Пушкіна, пасланыя ў Сібір, у якім з сапраўдным паэтычным натхненнем сцвярджае праваты дзекабрыстаў перад судом гісторыі і гордую веру ў канчатковую перамогу іх справы:

Наш скорбный труд не пропадет,
Из искры возгорится пламя.
. . . .
Мечи скуем мы из цепей
И пламя вновь зажжем свободы.

Успамінамі аб 14-м снежні не абмяжоўваліся інтарэсы Одоеўскага. Цэлы рад вершаў ён прысвяціў будням дзекабрысцкай катаргі. Ён быў першым паэтам, які апеў выдатных «рускіх жанчын-дзекабрыстак, паехаўшых за сваімі мужамі ў сібірскія турмы» («Далекий путь» — 1831—32 гад і «М. Н. Волконской» — 1829 год), ён апеў дзяцей дзекабрыстаў, народжаных у снягах Сібіры («Колыбельная песня»— 1832 год). На вялік жаль, да нас не дайшлі другія вершы Одоеўскага гэтага перыяду, якіх, згодна ўспамінаў і мемуараў прыяцеляў паэта, было шмат.

Закінутыя воляй расійскага самадзяржаўя на ўскраіны Сібіры, асуджаныя дзекабрысты жылі палітычнымі інтарэсамі свайго часу. Вялікае і радаснае пачуццё перажылі яны пры вестцы аб французскай рэвалюцыі 1830 года. Калі ўвосень 1830 года групу дзекабрыстаў, у ліку якіх быў Одоеўскі, перавялі з чыцінскай турмы ў новую турму Пятроўскага завода, яны, па словах дзекабрыста Лорэра, «увайшлі ў яе вясёлыя, з надзеяй на лепшую будучыню Еўропы». Одоеўскі дасканала выразіў гэтыя настроі. У вершах, прысвечаных пераходу з Чыты на Пятроўскі завод, паэт усклікае:

Славим нашу Русь, в неволе поем
Вольность святую.
Весело ляжем живые
В могилу за святую Русь.

Найвышэйшага напружання рэвалюцыйны пафас Одоеўскага дасягае ў вершы «При известии о польской революции» (1831 год), які побач з «Ответом Пушкину» належыць да лепшых твораў нелегальнай рускай паэзіі XIX стагоддзя:

Едва дошел с далеких берегов
Небесный звук спадающих оков,
И вздрогнули в сердцах живые струны,—
Все чувства вдруг в созвучие слились. .
Нет, струны в них еще не порвались!
Еще, друзья, мы сердцем юны!

Гэты твор, прасякнуты гарачай сімпатыяй к польскаму паўстанню 1831 года, папярэджвае больш позція артыкулы Герцэна, у якіх ён горача вітаў рэвалюцыйную Польшчу.

Хваравіта перажываўшы сваю адарванасць ад радзімы, душэўна надламаны Одоеўскі выліваў свае сумныя настроі ў вершах, але асабістае няшчасце не засланяла для дзекабрыста, верыўшага ў перамогу «доблеснага духу», вялікага сэнсу жыцця. Вось чаму ў цэнтральным творы Одоеўскага, у паэме «Василько» (1828—30 гады), асабістая тэма паэта не толькі не ўступае ў супярэчнасць з грамадскай, грамадзянскай тэмай, але гарманічна спалучаецца з ёю. Вобраз няшчаснага Васілько, па-здрадніцку асепленага сваім хітрым ворагам Давідам Ігаравічам, блізкі сумуючаму ў заключэнні дзекабрысту Одоеўскаму. Ён як-бы аплаквае ў паэме свой уласны лёс. Разам з тым радасць Давіда Ігаравіча і іншых тыранаў—князёў, якія «весела п'юць слёзы роднага народа», трактуецца Одоеўскім, як эфемерная радасць. Можна было асляпіць Васілько, але нельга пазбавіць яго ўнутранай перакананасці ў сваёй праваце, нельга пазбавіць яго ўнутранага святла ісціны, перамога якой непазбежна.

Пройдут князья, пройдет и суд князей,
Но истина на небе и в потомстве,
Как солнце просияет...

Па сутнасці, мы маем тут тую-ж палітычную ідэю, што і ў «Ответе Пушкину», але толькі апранутую ў ацягненую рамантычную форму.

У адрозненне ад свайго прыяцеля паэта-дзекабрыста В. К. Кюхельбекера, які рэзка асуджаў элегічную паэзію, Одоеўскі ў сваёй інтымнай лірыцы быў пераважна элегікам. Але элегіі Одоеўскага зусім не падобны на вершы паэтаў «школы» Жукоўскага, асмяяныя ў вядомым артыкуле Кюхельбекера «Аб напрамку нашай паэзіі». У рамантычную элегію 20-х год Одоеўскі ўнёс жывы дух грамадскага жыцця. Не беспрадметная журба, а глыбокае раздум'е над жыццём чалавека, які перажыў дзекабрысцкую трагедыю, не скаргі на адзіноцтва наогул, а пратэст супроць пакутнага адзіноцтва перадавых людзей эпохі, бяссільных у сваіх лепшых імкненнях,—вось што характэрна для вершаў Одоеўскага гэтага жанру. Папракаючы ў сваёй элегіі «Что вы печальны, дети снов?» (1829 год) бяздзейнае і трухлявае дваранскае пакаленне, Одоеўскі з гордасцю гаворыць аб тых адзіночках,

Кто был рожден для вдохновений
И мир в себе очаровал.
Но с юных лет пил желчь мучений
И в гробе заживо лежал...
. . . .
Кто жаждал жизни всеоб'ятной.
Но чей стеснительный обзор
Был ограничен цепью гор.
Темницей вкруг его темницы.

Вершы гэтыя былі напісаны, калі Лермантаву было каля 15 год, а між тым яны гучаць зусім па-лермантаўску. Падобных вершаў у Лермантава не мала і яны дасканала сведчаць аб тым, што пачуцці, перажытыя Лермантавым, зусім не былі чужымі яго старэйшаму сучасніку Одоеўскаму яшчэ да таго, як Лермантаў выступіў у друку.

Усё-ж у паэзіі Одоеўскага няма той сілы адмаўлення, няма таго бурнага парыву да дзеяння, якія так характэрны для Лермантава. Лермантаўскія матывы ў паэзіі Одоеўскага сумяшчаюцца з пушкінскім гарманічным поглядам на жыццё, з «светлай журбой» і добразычлівасцю ў адносінах да людзей. Гэта можна бачыць, напрыклад, у такіх вершах, як «Еще твой образ светлоокой» (1827 год), «В альбом» (1836 год), «Носятся тучи за ветром осенним» (1839 год). Нездарма сам Одоеўскі называў сваю паэзію «пакутнай і салодкай».

Цікава, што і ў стылявых адносінах лірыка Одоеўскага займае прамежкавае становішча паміж лірыкай пушкінскай школы і новай паэзіяй 30—40-х год, правадыром якой з'явіўся Лермантаў. Пушкінская плаўнасць верша спалучаецца ў Одоеўскага з характэрнымі для Лермантава патэтычнымі інтанацыямі і новымі рытмамі; пушкінская прастата і яснасць вобразаў — з характэрнымі для Лермантава смялымі вобразамі («Бал», «Куда несетесь вы, крылатые станицы?», «Глетшер» і інш.).

Як вядома, знаходзячыся ў Петрапаўлаўскай крэпасці і ў Сібіры, Одоеўскі праявіў шмат маладушнасці і, спадзяючыся на сваё вызваленне, пісаў нявартыя рэвалюцыянера пісьмы і вершы, накіраваныя цару і яго прыбліжаным. Гэтыя сумныя эпізоды ў светлым жыцці дзекабрыста Аляксандра Одоеўскага тлумачацца не столькі ліберальнымі ілюзіямі, колькі душэўным надломам, перажытым ім у турэмным казэмаце і на катарзе. З гадамі гэты душэўны надлом абвастрыўся і к другой палове 30-х год, асабліва ў часе прабывання на Каўказе ў 1837-39 гадах, Одоеўскі быў ужо зусім змучаным маральна і фізічна чалавекам. У гэтыя годы ён перажываў творчы заняпад. Глыбока змрочным пачуццём, раней чужым Одоеўскаму, прасякнуты яго вершы каўказскага перыяду. Але і напярэдадні сваёй смерці, як сведчаць аб гэтым «Воспоминания» сасланага на Каўказ амаль адначасова з Одоеўскім Н. М. Сацiна, ён захаваў «шмат лібералізма». Н. П. Огараў, які таксама спаткаўся з Одоеўскім на Каўказе, піша аб ім, як аб «самым выдатным з дзекабрыстаў...». Узнёслую характарыстыку Одоеўскага, дадзеную яго блізкім прыяцелем і таварышам па службе на Каўказе М. Ю. Лермантавым, мы прыводзім ў пачатку нашага артыкула.

З Лермантавым і Огаравым Одоеўскага звязвала не толькі дружба. Одоеўскі аказаў несумненны ўплыў на творчасць Лермантава, а Огарава ён асабіста вітаў, як свайго наследніка на паэтычнай арэне, аб чым Огараў чула расказвае ў артыкуле «Кавказские воды».

Одоеўскі выступае перад намі, як прамы папярэднік Лермантава і Огарава [illegible] рускай паэзіі, як жывое звяно [illegible] пушкінскай і лермантаўскай «ш[illegible] паміж дзекабрыстамі і Лерманта[illegible] равым, Герцэнам. Ужо адно г[illegible] Одоеўскаму права на сваё ўл[illegible] ў гісторыі рускай літаратуры.

УДАЛЫ ДЭБЮТ МАЛАДОГА ПІСЬМЕННІКА

У № 5—6 журнала «Полымя рэвалюцыі» надрукавана апавяданне Б. Зубца «Макошынскія любіцелі» — пераклад з рускай мовы, што чамусьці не адзначана рэдакцыяй. «Макошынскія любіцелі» — першы твор Б. Зубца і таму варта спыніцца на гэтым апавяданні.

У сяло Макошына, раскінутае на жывапісным беразе ракі Дзясны, з розных гарадоў з'язджаюцца на лета студэнты. Мясцовая інтэлігенцыя пры ўдзеле тэлеграфіста Майсея (ён-жа рэжысёр), настаўніка, настаўніцы, жонкі доктара і іншых удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, у мясцовым «тэатры» (б. панскай стайні) ставіць «Наталку-Палтаўку» Катляроўскага. Уся дзея апавядання і адбываецца вакол гэтай пастаноўкі.

Каму хоць раз даводзілася бачыць пастаноўкі вясковых драмгурткоў альбо самому ўдзельнічаць у іх, той з хваляваннем успомніць аб гэтым часе. І рухавы Майсей—актор і рэжысёр у штанах у клетачку, і Мікалай, у якога ў часе спявання арыі адклейваюцца і падаюць далоў вусы, і напор безбілетных гледачоў, і лямпы, узятыя напракат за контрамаркі, і тэатральная пячатка, што некалі належала невядомай установе,—усё гаворыць аб тым, што перад намі кавалак сапраўднага жыцця, што аўтар мае вострае вока і вялікае пачуццё, здольнае захапляць і хваляваць.

Пэўна, ні ў адным такім тэатры не абыходзілася без кахання, — не абыходзяцца без яго і макошынскія любіцелі. Апавяданне вядзецца ад першай асобы. Герой яго закаханы ў маладую настаўніцу, комсамолку Таню, якая толькі-што скончыла педтэхнікум. Паглядзіце, як малюе аўтар кароценькую сцэнку іх сустрэчы:

«Таня ўзялася за бліскучы руль (веласіпеда — Р. М.) і я сябе адчуў так, быццам яна дакранулася мае рукі...»

«Дзяўчына была ў вылінялай ад сонца шэрай касынцы, у простым сарафанчыку ў кветкі, бронзавы загар зіхацеў на яе руках, босай нагой яна, размаўляючы са мною, неўпрыметку рысавала на пяску кружочак»...

«Я глядзеў, потым закурыў, задуменна крануў пальцам тое месца, дзе яна трымалася за руль... і ўскочыўшы на машыну, паімчаў да ракі».

Колькі тут кволасці і першага глыбокага пачуцця кахання! Так можа пісаць чалавек, які сам глыбока адчувае і перажывае, які сам перажываў тое, што апісвае ў сваім творы.

Апрача дэталі з рулём веласіпеда, у апавяданні яшчэ не мала такіх трапных, яркіх дэталей. Вось, напрыклад, аўтар мімаходзь замалёўвае вячэрняе развітанне закаханых:

«Дзе-небудзь ля калітчі раздаецца ціхі дзявочы смех, чуецца неразборчывае цурчанне гутаркі, а потым грукае гэтая калітка і заблішчыць, аддаляючыся, агеньчык папяросы».

Вельмі цікавая штрыхавая дэталь, якою аўтар карыстаецца для характарыстыкі тонканогага настаўніка-актора на ролі першых палюбоўнікаў.

«Настаўнік прышоў расфуфыраным піжонам, разаслаў хусцінку на ганку і сеў, прывітаўшыся з усімі адным кіўком, патрыцый праклятый!»

Насавая хустачка малюе нам тып чалавека мудрэй, чым цэлыя, часам, раздзелы апісанняў у шмат якіх пісьменнікаў.

На-імпрэсіяністычнаму нервова, шчодра раскідвае аўтар сонца і цені, і да таго ясна ўяўляецца малюнак, што фізічна адчуваеш і раку, і ноч («лукавае свяціла»), і дрэвы, і людзей. Аўтар паставіў сабе задачай толькі праз канкрэтную рэчаіснасць у выглядзе паасобных дэталей маляваць і людзей і рэчы. Гэта шлях сапраўднага мастацтва і можна толькі віншаваць з гэтым Б. Зубца і жадаць, каб ён не саступаў у бок з яго нікуды, куды-б часам ні цягнулі яго вольныя ці міжвольныя крыўкі.

У апавяданні зіхаціць жывы, нездаблівы, добры гумар. Гэты гумар стасуецца і да першага героя, ад асобы якога вядзецца апавяданне. І гэта надае яшчэ больш пераканальнасці і жыццёвасці і без таго жыццёва праўдападобнаму і цалкам праўдзіваму малюнку, паказанаму пісьменнікам. Вось характэрны прыклад, не адзіны ў апавяданні:

«—Маэстак прыехаў,— абвясціў Жорж.
—Зноў будзе камедыя, мільён чарцей!
— Па Садоўскаму і Саксаганскаму,—дадаў я, паколькі і мастака я таксама не любіў за тое, што ён быў прыгажэйшы за мяне».

Апавяданне зіхаціць ад гумару. Усмешка, якая паяўляецца на твары чытача яшчэ пры чытанні першай старонкі, не сыходзіць больш, пакуль не дачытваецца ўсё апавяданне. А часам аўтар прымушае і моцна, весела рагатаць. А калі чытач смяецца разам з пісьменнікам і з адчуваннем радасці і бадзёрасці загортвае дачытаную кніжку, дык гэта найвялікшая пахвала аўтару. Іменна такое пачуццё здавальнення застаецца пасля чытання «Макошынскіх любіцеляў».

Вядома, што не ўсё яшчэ добра ў гэтым апавяданні. У ім ёсць грунтоўныя заганы. Аўтар не здолеў яшчэ выкінуць з апавядання ўсё пабочнае, што пры ўважлівым праглядзе кідаецца ў вочы. Так, напрыклад, вельмі цікавым і вобразным з'яўляецца другі раздзел, дзе апісваецца сяло Макошына з яго раздзяленнем часу сутак на прамяжуткі ад поезда да поезда. Але прыглядзеўшыся, заўважаеш, што гэты раздзел арганічна, сюжэтна не ўвязан у апавяданні. Паўтараю, ён мае не малую мастацкую вартасць, але ён самастойны, ён — толькі ілюстрацыя ў апавяданні, а не арганічная састаўная яго частка.

Гэта вынікае з нявопытнасці яшчэ маладога пісьменніка. Ён часам здольны захапляцца без меры створаным ім-жа малюнкам, яму шкада бывае скончыць яго, бо паглядзіш—у запасе яшчэ гэтулькі фарбаў... Гэтак захапіўся Б. Зубец сваім Майсеем. А калі-б ён трошкі адступіўся ад створанага ім наогул добрага героя,—тыповага, чалавечнага, жывога,—дык убачыў-бы, што Майсей хоць і ванарта гаваркі, але яго прымаўку «...чарцей»—у рознай колькасці—варта скараціць. Ад гэтага выйграў-бы і Майсей, і апавяданне ў цэлым, і сам аўтар.

Наогул апавяданне добрае, гэта сапраўды мастацкі твор, а не практыкаванне на зададзеную сабе схему.

Б. Зубец уладае бясспрэчным талентам мастака. Будзем думаць і спадзявацца, што гэты талент расквітнее і парадуе нас так, як мы гэтага хочам, прачытаўшы «Макошынскія любіцелі».

Р. МУРАШКА.

КОНКУРС НА П'ЕСУ ДЛЯ ДЗІЦЯЧЫХ ДРАМГУРТКОЎ

Наркамасветы Украіны і ЦК ЛКСМ УССР абвясцілі конкурс на п'есу для дзіцячых самадзейных драмгурткоў. Конкурс прадугледжвае напісанне п'ес для дзяцей малодшага ўзросту (1 — 4 клас) і сярэдняга ўзросту (5 — 7 клас). У конкурсе могуць прыняць удзел усе грамадзяне СССР. П'есы павінны быць высокаякаснымі, мець цікавы сюжэт, адну альбо дзве дзеі, павінны быць зручнымі для пастаноўкі ў школьных умовах.

Для лепшых п'ес вызначаны тры прэміі — у 4.000, 3.000 і 2.000 рублёў. Тэрмін падачы п'ес — 1 кастрычніка 1939 года. Конкурс закрыты. Адрас: Кіеў, вуліца Кірава, 16, Цэнтральны дом мастацкага выхавання дзяцей.

Калектыў мастацкай самадзейнасці калгасаў, соўгасаў і МТС БССР, які прымаў удзел у выступленнях на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. На здымку: рэпетыцыйны момант.
Фота І. Каплінскага.

АБ ТВОРЧАСЦІ Р. БРОХЕС

У асобе Р. Брохес мы маем прадстаўніка старэйшага пакалення яўрэйскіх пісьменнікаў. У пісьменніцы багаты жыццёвы вопыт і 40-гадовы стаж творчай работы.

У Р. Брохес не было радаснага маленства. Яе маленства і маладосць прайшлі ва ўмовах капіталізма і самадзяржаўя. З 9-гадовага ўзросту працавала ўжо яна ў розных гаспадароў, каб зарабіць сабе на кавалак хлеба.

Пісаць Р. Брохес пачала ў 1899 годзе. Калі ёй было яшчэ 16 год, у тагочасным яўрэйскім журнале «Дэр Юд» паявілася яе першае апавяданне. З таго часу яна сістэматычна друкуецца ва ўсіх яўрэйскіх выданнях Расіі і Амерыкі.

Першыя дзіцячыя апавяданні Р. Брохес адразу прыцягнулі да яе ўвагу літаратурнай грамадскасці. Апавяданні Р. Брохес пачынаюць перакладаць на іншыя мовы: рускую, англійскую, нямецкую, польскую. У прыватнасці, адно апавяданне Р. Брохес у рускім перакладзе было надрукавана ў пецярбургскім журнале «Современный мир» за 1906 год.

Прычына ранняга поспеху творчасці Р. Брохес заключалася ў глыбокім веданні пісьменніцай дзіцячай псіхалогіі, сур'ёзным падыходзе да паказу эксплаатацыі дзяцей пры капіталізме.

Асноўны фон, на якім разгортваецца сюжэт у творах Р. Брохес, — яўрэйскае мястэчка. Яе героі — хваравітыя, стомленыя дзеці. Яны ніколі не смяюцца, не свавольнічаюць. У іх вачах свеціцца толькі журба і сум. У іх няма дзіцячай радасці. Гэтыя 8-гадовыя старыкі мараць як мага хутчэй стаць швачкамі альбо возніками, каб дапамагаць сваім сухотным бацькам. Гэтыя дзеці рана пачынаюць самастойна здабываць кавалак хлеба.

З вялікай любоўю адносіцца Р. Брохес да гэтых малых кармільцаў. Аўтар у кожным сваім апавяданні выводзіць маленькага героя, раскрывае яго псіхалогію, яго жаданні і мары, і паказвае, як гэтыя дзіцячыя жаданні і мары гінуць у душнай атмасферы «мяжы аседласці», ва ўмовах беднага, забітага яўрэйскага мястэчка.

У сваім лепшым апавяданні «Гэлька» Р. Брохес паказвае бедную, прыніжаную маці, якая вядзе сваю малую дачку Гэльку ў вялікі горад, каб аддаць у домработніцы да багатай сваячкі. Маленькая Гэлька ўпершыню едзе з мястэчка ў вялікі і чужы горад. Падругі зайздросцяць ёй.

Гэлька ходзіць з маці па незнаёмых вуліцах. Яна баязліва азіраецца навакол. Шырокімі ад здзіўлення вачыма глядзіць яна на высокія дамы, на мноства багатых і сытых людзей, што снуюць па вуліцах.

Але вось яны прыходзяць да багатай сваячкі. Тоўстая мадам высокамерна адносіцца да бедных наведвальніц. Сваё абяцанне прыняць Гэльку на службу яна агаварвае ўмовай, каб тая без дазволу гаспадыні нічога не ела.

І вось маленькая Гэлька на службе. Ёй даюць нянчыць дзіця, якое цяжэй за яе. Гэлька галодная. Яна цэлы дзень нічога не ела. Заўважыўшы на талерцы белую булку, Гэлька не можа больш стрымацца і шпарка адкусвае кавалак. Але ў тую-ж мінуту ўваходзіць мадам і выганяе яе з дому.

У вобразе дзяўчынкі Гэлькі Р. Брохес удалося адлюстраваць тыповы лёс дзяцей працоўных ва ўмовах капіталізма.

У апавяданні «Я — Ліпка» аўтар прыводзіць маналог 9-гадовай дзяўчынкі. Маленькая дзяўчынка расказвае аб сваім безрадасным маленстве, аб тым, як яе маці прымушана працаваць па цэлых начах, каб пракарміць сям'ю.

Гэта апавяданне хвалюе дзіцячай непасрэднасцю і прастатой мовы.

У апавяданні «Пасля работы» аўтар рысуе маленькіх дзяўчынак-сястрыц, якія ідуць з працы дамоў і бачаць, як вясяляцца дзеці іх гаспадара-фабрыканта. Яны з зайздрасцю глядзяць скрозь шчыліны плоту на гэтых добра апранутых і бесклопотных дзяцей, у якіх ёсць шчаслівае і вясёлае маленства.

Гэта апавяданне вельмі эмацыянальнае і робіць вялікае ўражанне сваёй сацыяльнай завостранасцю.

Творчасць Р. Брохес не пазбаўлена недахопаў. Асноўны яе недахоп у тым, што ў сваім творчым метадзе яна моцна звязана з даўно зніклыўшым стылем дарэвалюцыйнай дзіцячай літаратуры, які заключаўся ў сантыментальнай размякчанасці, характэрнай для такіх яўрэйскіх пісьменнікаў, як Дынензон і А. Рэйзін. Гэта сантыментальнасць у творчасці Р. Брохес даходзіць часам да сюсюкання. Асабліва гэта адчуваецца ў апавяданнях «Дзядзька Іосель», «Жэрка» і інш. Перад Р. Брохес стаіць цяпер сур'ёзная задача — вызваліцца ад гэтай размякчанай сантыментальнасці.

За апошні час мы заўважваем пэўны пералом у Р. Брохес, асабліва ў дзіцячых апавяданнях аб савецкай рэчаіснасці.

Р. Брохес каштоўна для нас сваім глыбокім веданнем жыцця дзяцей, іх жаданняў і летуценняў, дзіцячай псіхалогіі. Гэтая дадатная рыса асабліва вылучаецца ў яе апавяданні «Сварка праз сценку», змешчаны ў зборніку, выпушчаным выдавецтвам «Дэр Эмес». У гэтым апавяданні Р. Брохес удалося даць майстэрскі дыялог двух дзяцей.

У апавяданні Р. Брохес заўсёды ёсць дзіцячае непасрэднае ўспрыманне свету, даступная дзіцячаму разуменню мова.

За апошні час Р. Брохес працуе вельмі прадукцыйна. Маскоўскім яўрэйскім выдавецтвам «Дэр Эмес» выпушчана ўжо некалькі кніжак, сярод якіх вылучаецца апавяданне «Арлёнак», напісанае ў фальклорным стылі. Беларускім выдавецтвам таксама выпушчана некалькі яе кніжак на яўрэйскай і беларускай мове.

Творчасць Р. Брохес мае важнае значэнне, бо яна знаёміць нашых радасных савецкіх рабят з жыццём дзяцей у праклятым мінулым.

З. БАРСУК.

Слабыя вершы

На старонках кожнага нумара журнала «Полымя рэволюцыі» змяшчаецца шмат вершаў малазых і пачынаючых паэтаў; больш таго, трэба сказаць, што палова ўсіх друкуемых у «Полымі рэволюцыі» матэрыялаў належыць пяру маладых. Гэта яскравае сведчанне росту маладых талентаў, маладой савецкай літаратуры. Актуальнасць тэматыкі, аптымізм, любоў да радзімы, адданасць народу і справе комунізма, нянавісць да класавых ворагаў — асноўныя якасці творчасці маладых паэтаў.

Вядома, у працэсе авалодвання паэтычным майстэрствам маладыя паэты ў сваіх творах не пазбаўлены істотных недахопаў. Мы пастараемся на вершах, змешчаных у № 4 журнала «Полымя рэволюцыі», паказаць некаторыя з недахопаў, якія характэрны для большасці пачынаючых паэтаў, ды і не толькі пачынаючых.

У № 4 «Полымя рэволюцыі» мы сустрэлі прозвішчы маладых аўтараў, якія часта друкуюцца на старонках нашага друку: М. Сямашка, А. Бялевіч, В. Рагуцкі, А. Радзюк, Л. Гаўрылаў. Пішуць яны пра народную любоў да Сталіна, пра шчаслівае жыццё калгаснікаў, пра абарону радзімы, пра каханне і іншае. Якія цікавыя і ўдзячныя тэмы! Але паэта заўсёды напаткае няўдача, калі замест рэалістычнага адлюстравання нашай рэчаіснасці ў творах будзе фальш, лакіроўка, калі канкрэтны і глыбокі паказ жыцця будзе падменен схемай.

Альфрэд Радзюк надрукаваў верш «Цырульнік». Змест такі: у калгас гарачай вясновай парою прыязджае цырульнік, малады хлапец «з ласкавымі вачыма». Вечарам ён прымае гасцей:

Прышло людзей даволі шмат
З цікавасцю туды,
Найболей хлопцаў і дзяўчат,
А з імі і дзяды.
Размову цёплую вялі
Яны паміж сабой,
Усе брыцца, стрыгчыся прышлі
К цырульніку ў пакой,
І вельмі радавала ўсіх,
Што к ім прыехаў госць.
Цырульня маецца у іх,
І ў ёй цырульнік ёсць!

Тут узята малазначная тэма (прыезд у калгас цырульніка), якая наўрад ці заслугоўвае ўвагі паэзіі. І «ласкавыя вочы» цырульніка, і «цёплая размова», і тое, што цырульнік у калгасе толькі госць, і калгаснікі, якія з цікавасцю прышлі брыцца (быццам раней яны ніколі не брыліся) — усё гэта ў вершы гучыць фальшыва. Нейкая цырульная ідылія! Такая рэч, як цырульня, — у калгасе з'ява абыдзённая. Няўдача Радзюка заключаецца ў няведанні жыцця, у пошуках зводш арыгінальнай тэмы замест глыбокага раскрыцця думак і пачуццяў калгаснага сялянства.

У большасці маладых аўтараў адсутнічае творчая самастойнасць, адсутнічаюць пошукі сваёй творчай індывідуальнасці. Даволі паявілася на старонках друку таленавітаму, арыгінальнаму вершу, як зараз-жа хлыне пятнаццаць пад ападобных, але ўжо шэрых і нецікавых вершаў. Так нахлынулі і адхлынулі вершы пра затрыманне шпіёнаў, пра здрадлівых каханак і іншае. А кожнаму маладому паэту трэба гаварыць сваімі словамі, глядзець на свет сваімі вачыма.

У вершы «Падарунак» Рагуцкі паказвае развітанне маці з дачкой, якая едзе на вучобу ў Маскву. У часе растанні маці, замест шчырых і прачутых слоў, гаворыць нейкую абстрактную, малазразумелую прамову:

Кацярынка! славаю краіны
Наша песня звонкая сагрэта.
Наша песня—вольная пушына (!).
Наша песня—права на асвету! (!)

У гэтым вершы крыклівая абстракцыя (якая даходзіць да бяссэнсіцы) спалучаецца, як ні дзіўна, з сантыменталізмам. У вершы шмат такіх слоўцаў, як «дзіцятка», «галубочак», «дачушка».

У вершы Бялевіча «Пойдзем зноў мы за наркомам» не знойдзеш ніводнага жывога радка, ніводнага свежага вобраза. Калі чытаеш такія страфы:

Што за мілая за песня,
Баявы задор,
Разлілася як прадвесне
Між пізіны гор,
Закружыла вольным птахам
Аж ля ясных зор...

альбо:

А напеў такі суровы
Ліўся, не змаўкаў,
Адклікаліся дубровы,
Стэп ім падпяваў, —

го адразу ў памяці ўзнікае шмат даўно прачытаных вершаў. Верш Бялевіча не хвалюе, нічога новага чытачу не дае.

Паэзія патрабуе надзвычайнай лаканічнасці. Але прынцып: каб было «словам цесна, а мыслям прасторна»—не заўсёды захоўваецца маладымі паэтамі. А. Радзюк у вершы «Я цябе палюбў...» піша:

Быў шчаслівы заўсёды тады я з табою,
Чуў удары, здавалася, сэрца твайго,
Размаўлялі ўвесь час мы пра лёс свой абое —
Палымнеў у грудзях нашых цёплы агонь (?).

Мноства лішніх слоў (заўсёды, тады, здавалася, увесь час, абое...) робяць верш вадзяністым, расцягнутым, мала паэтычным. А апошні радок—зусім дрэнны (асабліва «цёплы агонь»).

Верш Гаўрылава «Запахнуць ноччу духавітай травы» вылучаецца сярод другіх сваёй эмацыянальнасцю. У гэтым вершы сустракаюцца свежыя метафары:

Мы ў човен сядзем, плёскатам вясла
Маладзіка разломім палавіну.

Але ў гэтым-жа вершы сустракаюцца і невыразныя страфы, чытаючы якія цяжка ўявіць, аб чым піша аўтар:

У водыру палёў плыве здалёку
Узрушаны і жвавы вобраз твой,
Плыве спакоем зорак яснавокіх
Над вішнямі, над хатай, над травой.

Трэба, каб метафара, эпітэт былі даходчывымі, канкрэтнымі, каб яны лёгка запаміналіся, як запамінаюцца, скажам, радкі Багрыцкага: «Лягушечья прозелень дачных вагонов», ці «Я выберу звонкий, как бубен, кавун».

Чытаючы вершы маладых, у многіх з іх заўважаеш выключную аднастайнасць мастацкіх прыёмаў і ізабразіцельных сродкаў. Здаецца, піша адзін чалавек, які, начытаўшыся чужых вершаў, аперыруе гатовымі штампамі. Вось прыклады збітых метафар і эпітэтаў: «усмешка вачэй», «гора ліхое», «шчаслівая пара», «гарачы час», «ласкавыя вочы», «як шары вечар у калгас на крылах прыляцеў» (Радзюк); «дружба маладая», «песня звонкая», «песня пуюўная», «сенажаць спеленца абрусам» (Рагуцкі); «цёплы вечар», «цёплы май», «наш сад квітнеў, як наша жыццё» (Сямашка); «мілая песня», «баявы задор», «песня закружыла вольным птахам», «ясныя зоры», «край шчаслівы», «напеў суровы», «грозныя палкі» (Бялевіч).

Звычайна слоўнік пачынаючых паэтаў абмяжоўваецца такімі словамі, як дружба, маладосць, радасць, шчасце, усмешка, агнявы, зара, вясна, песня, вясёлы, любімы і т. д.

Так, у вершы Рагуцкага слова «песня» (сумесна з сінонімамі) ужыта сем разоў. Гэта-ж слова ў Бялевіча ўжыта шэсць разоў, у Гаўрылава тры разы. Радзюк піша «малады хлопец», Рагуцкі — «малая дружба», Сямашка—«малады сад», Бялевіч — «малыя казачкі».

Вось, на маю думку, некаторыя з недахопаў у маладых паэтаў. Вывад можна зрабіць толькі адзін: трэба глыбей вывучаць жыццё, мову, авалодваць культурай, паэтычным майстэрствам, не ісці за штампамі, а смела шукаць свой паэтычны голас. Трэба паставіць у віну рэдакцыі журнала «Полымя рэволюцыі», што на старонках журнала паяўляецца шмат сырых, слабых вершаў.

П. ПАНЧАНКА.

Я. ШАРАХОЎСКІ

„УПЭЎНЕНАСЦЬ“ П. ПАНЧАНКІ

У літаратуру ідуць па-рознаму. Бывае, што і вялікія пісьменнікі праходзяць праз перыяд шуканняў і наследвання папярэднікам альбо сучаснікам. Але заўсёды неяк па-асабліваму радуе, калі малады пісьменнік заяўляе аб сабе адразу, калі адразу вызначаецца арыгінальнае дараванне, так што пытанне аб папярэдніках і настаўніках нават не ўзнікае. Іменна так заявіў аб сабе ў першай кніжцы вершаў «Упэўненасць» малады паэт Пімен Панчанка.

Ужо гэта першая кніжка сведчыць аб тым, што мы маем справу з паэтам лірычнага дараванна. Зусім зразумела, што паэт у ёй яшчэ цалкам не раскрыўся і адсюль некаторыя асаблівасці кніжкі. Значнае месца ў ёй займае лірыка прыроды, якая, аднак, ніколі не займае самадаўлеючага месца, а заўсёды даецца як элемент калгаснага жыцця, падпарадкавана паказу чалавека. Досыць выразна раскрыт у кніжцы лірычны вобраз паэта, арганічна звязанага з калгаснай рэчаіснасцю. Значнае месца аддзена ў зборніку і аб'ектывізіраванаму паказу савецкага чалавека, але тут у паэта яшчэ не хапае сіл і ведання людзей і таму вобраз лірычнага героя ў кніжцы толькі намячаецца. Гэтым тлумачыцца той факт, што з вершаў, напісаных у жанры сюжэтнай лірыкі, тав. Панчанку найбольш удаюцца тыя, дзе героем выступае малады чалавек, псіхалагічна больш блізкі паэту.

У кніжцы шмат маладосці. Яна — у юнацкай непасрэднасці пачуццяў, у вясновa-святочным успрыманні прыроды, у [illegible]цыянальнай дамінанце вершаў — лі[illegible] кахання. У самых адносінах да [illegible], у трактоўцы тэмы кахання [illegible] маладосці.

[illegible] матэрыялу і тэматыцы вершы тав. [illegible] звязаны з калгаснай рэчаіснас[illegible] ён [illegible] не як чалавек, які бачыць калгасную рэчаіснасць збоку, а як радавы ўдзельнік калгаснага жыцця. Паэтычнае «я» не пастаўлена над калгасным жыццём, а арганічна зліта з ім. Такі кут зроку дае паэту магчымасць рабіць з выключнай непасрэднасцю лірычныя замалёўкі калгаснай вёскі. Замалёўкі гэтыя даволі рэалістычныя, напісаныя з некаторай рамантычнай прыўзнятасцю. У вершах «Зажынкі»:

Устрывожаны песняй узнёслай
Дрымотны спакой на палях.
Жняярка, ўздымаючы вёслы,
У хвалі жытоў паплыла.
І жыта, як лес, ападае,
Шуміць залатою ракой.
Сноп першы сама звеннявая
Звязала умелай рукой.

Гэта тыповая для зборніка замалёўка. Як можна бачыць на гэтым прыкладзе, элемент ізабражальны пераважае тут над элементам мысліцельным. Гэта, па пераважнасці, замалёўка сёчешняга дня, без глыбокай перспектывы, але — прывабная сваёй непасрэднай лірычнасцю, эмацыянальнасцю.

Як-жа паказвае тав. Панчанка людзей? Адным з найбольш удалых вершаў пра людзей калгаснай вёскі з'яўляецца балада «Пра Васілька і правадыра». Тут проста і пераканаўча створан псіхалагічны рысунак: гора маці над хворым сынам, пераход да надзеі, што яго выратуе таварыш Сталін, радасць маці пасля таго, як на самалёце прыляцеў доктар і сыну была аказана дапамога. Тут паэт добра карыстаецца дэталлю. Гаруе маці над сынам, і паэт піша:

Асіраціць захацеў ты нас, сынку?
Іскрай пякучай упала слязінка.

Але вось сыну ўжо аказана дапамога, і паэт прымушае працаваць тую-ж дэталь:

Цяжка пра матчыну радасць сказаць.
Радаснай зоркай — упала сляза.

Сюжэтны верш «Закон» сярод вершаў іншых паэтаў аб Сталінскай Канстытуцыі вылучаецца сваёй арыгінальнасцю. У ім, па кантрасту з лёсам сялянскага хадака, які шукаў зямлі і законаў і не знаходзіў іх, паказана значэнне «вялікага закона», прынесенага мудрым настаўнікам «як сонечны дар» народу. Гэта — адзін з лепшых вершаў аб Сталінскай Канстытуцыі.

Сюжэтная лірыка ў зборніку, бадай, і абмяжоўваецца гэтымі двума вершамі. Але ў зборніку ёсць некалькі вершаў, напісаных па прынцыпу лірычнай кампазіцыі, у якіх таксама паказваюцца людзі. Гэта— «На пашы», «Вясновыя мары», «Размова» і «Зварот байца». У першым гэты паказ ажыццяўляецца апісальна, у наступных двух — праз дыялаг і ў апошнім — праз лірычны маналог.

У вершы «На пашы» мы знаходзім досыць трапную партрэтную замалёўку:

Амаль што дзед. Сняжок віска
Ад спёкі летняй не растане,
А вочы хітра апляла
Тканіна зморшчыкаў густая.

«Вясновыя мары» характэрны тым, што ў іх наглядна відаць розніца ва ўзроўні апісання прыроды і паказу чалавека ў тав. Панчанкі. У першай частцы верша створан сакавіты малюнак прыроды вясной. У другой даецца дыялаг з брыгадзірам—так сказаць, дзелавая частка верша. Брыгадзір «стаіць разгублены і дужы» але гаворыць:

Тужыць, браток, не маем часу,
Калі з клапотамі ідзе
З палёў вільготных да калгаса
Сяўбы вясновай рунны дзень.

Гэта частка верша не ўдалася Панчанку. Матывіроўка, што калгаснік не ўмее адчуваць і перажываць, не ўмее думаць таму, што яго галава заўсёды занята калгаснай заботай. — некалькі фальшывая. Гэта неабходна падкрэсліць, таму што падобныя памылкі робіць не адзін тав. Панчанка. Трэба калгасніка паказваць рэалістычна, а не паводле куцай схемкі.

З гэтай-жа прычыны трэба лічыць зусім няўдалым верш «Размова». Калі хлапец у размове са стаханаўкай палёў гаворыць мастацка пераканаўча, напрыклад:

Радасць будзе мне не ў радасць
Без цябе... Калі-б удвох...
Пераходзь у маю хату—
Ашчаслівіш, далібог!—

то дзяўчына, па віне аўтара, знаходзіцца ва ўладзе ахарактарызаванага вышэй прымітыва. І бяда тут не наогул у тым, што дзяўчына не хоча выходзіць замуж, калі хлапец дрэнна працуе, а ў тым, што гэты момант праведзен немастацка, з грубай просталінейнасцю. А, апрача таго, яе адказ выражан проста недапрацаванымі радкамі.

Зусім інакш паказаны адносіны да працы калгасніц у вершы «Зажынкі». Тут Панчанка не падганяе іх пад схему, а проста стварае малюнак — як калгасніцы ідуць зажынаць жыта. Словы звеннявой: «Калгаснае шчасце, сяброўкі, нараджаецца ў тысячах тон» — гучыць як абагульненне. Але гэты верш сведчыць аб тым, што тав. Панчанка не заўсёды разумее ролю канцоўкі для верша. У яго ёсць добрыя канцоўкі (у «Нараджэнні дня», напрыклад), але ёсць і дрэнныя, і таму на гэты момант трэба звярнуць увагу. Радкі канцоўкі павінны быць асабліва апрацаванымі, таму што ў канцоўцы даецца як-бы вывад з усяго верша, а радок: «Звярэм без загуб ураджай» — гучыць дрэнна: «загуб» вылазіць з кантэкста. Слабыя канцоўкі і ў вершах «Верасень», «Вясною».

У вершы «Зажынкі» форма лірычнага маналога не зусім вытрымана, яна ўскладнена пераходам на апісальны паказ. Верш «Зварот байца» — адзін з лепшых вершаў зборніка — пачат з лірычнага маналога, ускладнен пераходам на дыялаг з рэчкай. Тут надзвычай удала паказан зварот байца з Чырвонай Арміі ў свой калгас. Верш гэты лаканічны па мове, але разам з тым і вельмі лірычны. Сярод многіх іншых вершаў ён вылучаецца мужнымі інтанацыямі, што надзвычай пасуе да распрацоўваемай тэмы. У сінтаксічнай будове сказа тонка падкрэсліваецца кароткасць і катэгарычнасць, уласцівая мове ваенных.

У форме лірычнай размовы напісаны вершы «Вішня», «Я ўсмешку тваю пазнаю», «Загінуўшаму сябру», «Я блакітных пралесак сягодня нарву». Верш «Вішня» цікавы тым, што традыцыйны сімвал кахання, вядомы з фальклору, у ім скарыстоўваецца ў новай функцыі. Новае ў скарыстанні гэтага сімвала заключаецца ў тым, што тэму кахання паэт удала спалучае з тэмай грамадска-палітычнай: спелыя вішні ў яго збліжаюцца з колерам чырвонаармейскіх зорак.

На шлёмах гараць нашы зоры
Той вішні чырвоным агнём.

Сэнсавы паварот вобраза зроблен надзвычай удала. У вершы дадзена добрая сэнсавая нагрузка на радок. Напрыклад: «Вятры дарагія павеюць» і г. д. Тут эпітэт «дарагія» нясе трапную нагрузку (у сэнсе: «ад дарагога чалавека»).

У вершы «Я ўсмешку тваю пазнаю», як і ў радзе іншых, аб чым будзе сказана ў сваім месцы, ёсць надзвычай удалыя дэталі. Напрыклад:

Ты крынічнай набрала вады,
І ў напоўненых вёдрах панесла
Два іскрыстыя сонцы.

Гэта — сапраўдная паэзія. Але такія знаходкі нельга скарыстоўваць некалькі разоў. А часам тав. Панчанка паўтараецца. У вершы «Вішня» — «зоры гараць вішні чырвоным агнём», у другім вершы мы сустракаем «вішнёвы пажар». «Гром бубна» збліжаецца з сапраўдным громам, у некалькі вар'іраванай форме, у трох вершах. У адным вершы прадрог на досвітку бярэзнік, у другім — каласы. У адным вершы на сонца высоўвае нос мядзведзь, у другім — ваўкі. Паўтараюцца адны і тыя-ж дэталі і ў паказе калгаснай заможнасці. У вершы «Пяе беларускі народ» калгаснік вязе воз «поўна збожжам нагружаны», у вершы «Упэўненасць» мы зноў бачым той-жа «поўны воз». Гэтай загану трэба пазбаўляцца як мага хутчэй, бо падобныя перапевы ствараюць уражанне беднасці мастацкай палітры, чаго на самой справе ў Панчанкі няма.

Тав. Панчанка добра адчувае прыроду і ўмее вобразна і эмацыянальна яе замалёўваць. Але ў зборніку няма пейзажнай апісальнай лірыкі. Пейзажныя элементы ў тав. Панчанкі скарыстоўваюцца альбо як фон для паказу людзей, альбо для стварэння вобразаў калгаснай працы, альбо дапамагаюць выяўленню лірычнага настрою, што агарнуў паэта. Іменна ўмеламу карыстанню пейзажнымі элементамі ён абавязан шматфарбнасці, маляўнічасці сваіх вершаў. Гэта асабліва будзе зразумела, калі прыняць пад увагу, што тав. Панчанка бярэ амаль выключна вясновы пейзаж. Лірыка прыроды ў тав. Панчанкі мастацкая, але трэба паказаць і на адну хібу. Часам ён не вытрымоўвае храналогіі жыцця прыроды, храналогіі калгаснай працы. Напрыклад, у вершы «Пяе беларускі народ» — адбітак вясны ў юнацкіх постацях і ў той-жа час наліліся антонаўкі сокам густым (восень), калгаснік вязе воз, поўна збожжам нагружаны (лета). У вершы «Упэўненасць» час жніва адносіцца к верасню.

Сярод лірычных вершаў з грамадска-палітычнымі настроямі лепшымі з'яўляюцца «Сталіну», «Радзіме», «Пагранічча», «Заўтра». Гэтыя вершы таксама эмацыянальныя, прачутыя. Вось паэт гаворыць аб радзіме:

О, радзіма, табою напоўнена сэрца да краю.
І заўжды: ці працую, ці пільна на варце стаю,
Я твой велічны вобраз у думках сваіх уяўляю
І люблю, як жыццё, я зямлю маладую тваю.

З неўпамінаўшыхся вершаў, з ліку лепшых у зборніку, трэба адзначыць яшчэ «Красавіцкую навальніцу» і «Нараджэнне дня». Паэму «Сувей» можна было не ўключаць у зборнік і ён-бы ад гэтага нічога не страціў. Задача, пастаўленая аўтарам у паэме, аказалася яму не па сіле, у яго яшчэ нехапае мастацкіх сродкаў, каб стварыць псіхалагічна разгорнуты вобраз чалавека, тым больш, што ў паэме трэба было не толькі нарысаваць характар, але даць яго развіццё.

У першай кніжцы тав. Панчанка паказаў сябе здольным лірыкам, які абяцае вырасці ў цікавага паэта.



«Зверствы нямецкіх акупантаў» — эскіз да карціны маст. Л. Рана для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».
Фота І. Каплінскага.

„МУЖНАСЦЬ“

(Новы мастацкі фільм вытворчасці кіностудыі „Ленфільм“)

Дагэтуль знаёмства гледача з лётчыкамі слаўнай сталінскай авіяцыі на экране падобна было на ўрачыста-параднае прадстаўленне. Акуратна надцягнутыя, малайцаватыя, выдатна дысцыплініраваныя — усе яны, як дзве кроплі вады, былі падобны адзін на другога. Іх колькі заўгодна можна было перамяшчаць з адной карціны ў другую і сюжэты карцін зусім не змяньваліся. А вобразы тым больш. Праўда, адносна вобразаў лётчыкаў трэба зрабіць агаворку. На вялікі жаль, іх яшчэ проста няма.

Жыццё стварыла незабыўныя вобразы Чкалава, Громава, Коккінакі. Осіпенка, Хальзунова. — кіно-ж не паднялося вышэй халаднаватага стандарту, па якому створана ўжо не адна схема бравага, бясстрашнага пілота Чырвонай авіяцыі, далёка не падобнага на прататып у жыцці. Аб мужнасці і геройстве нашых лётчыкаў ведае ўвесь свет. Яны сапраўды дысцыплініраваныя, моцныя, прыгожыя і бязмежна смелыя. Але ад твораў мастацтва глядач мае права патрабаваць і патрабуе не столькі апісання гатовых якасцей, колькі самага працэсу іх нараджэння і росту.

«Мужнасць», бадай, першая карціна на тэму, у якой аўтар сцэнарыя Кубанскі і рэжысёр Калатозаў паказалі, як з простага, звычайнага лётчыка грамадзянскай авіяцыі нарадзіўся паветраны герой. Аляксея Таміліна цяжка было назваць нават звычайным. У аэрапорце яго проста называлі паветраным хуліганам—за лёгкадумнае ліхацтва ў паветры. Але вось Тамілін атрымлівае адказнае заданне: тэрмінова даставіць на самалёце вельмі важны пакет на пагранзаставу. Траса была вельмі цяжкая, ляцець трэба было сярод памірскіх цясніп. Тамілін тым не менш выканаў заданне, уручыў пакет, у якім паведамлялася аб мяркуемым пераходзе буйнага шпіёна за кардон,—і паляцеў назад.

З-за пашкоджання маслаправода Тамілін робіць вымушаную пасадку ў гарах і нечакана трапляе ў пастку дыверсантаў. Пад пагрозай смерці яны загадваюць Таміліну пераправіць праз граніцу на самалёце таго самага шпіёна, якога падсцерагалі на заставе. Абяззброены Тамілін нібы згаджаецца, але ў паветры ён уступае ў жорсткі бой з ворагам, які сядзіць за яго спіной. Перад гледачом праходзяць галавакружыцельныя фігуры вышэйшага пілатажу. Гэта Тамілін вырашыў напалохаць свайго пасажыра да страты прытомнасці. Колькі разоў самалёт падаў уніз, узлятаў угору, перакульваўся, рабіў мёртвыя петлі, пакуль шпіён не страціў прытомнасці Знясілены барацьбой з каварным бандытам, Тамілін усё-ж апускаецца на свой аэрадром і здае ў рукі аховы буйнага японскага шпіёна.

Эпізод у паветры—асноўны эпізод ва ўсёй карціне. На ім уласна і пабудаван сюжэт фільма, зробленага ў плане войстра-напружанай кінонавелы.

І больш за ўсё ў гэтым эпізодзе раскрываецца сапраўдная сутнасць лётчыка Таміліна. Да сутычкі з бандытамі цяжка было сказаць, на што здольны Тамілін, апрача блазноўскага ухарства ў паветры. Але вось для Таміліна наступіў момант выпрабавання не толькі як для лётчыка, але і як для патрыёта сваёй радзімы. Бліскуча вытрымаў гэта выпрабаванне просты лётчык грамадзянскага флота. Ён аказаўся самым сумленным і храбрым патрыётам.

А такіх-жа, як ён, радавых, непрыкметных з першага погляду людзей—сотні тысяч у нашай краіне. І кожны з іх у патрэбную хвіліну раскрые свае выдатныя ўнутраныя якасці гарачага савецкага патрыёта. Такія ўжо асаблівасці нашай эпохі. Карціна тым і вылучаецца, што раскрывае гэту асаблівасць на канкрэтным пераканаўчым і амаль звычайным выпадку.

Ролю лётчыка Таміліна выконвае вядомы ўжо гледачу таленавіты актор-ордэнаносец Олег Жакаў. У прыстасаванні да гэтага актора слова «іграе» яўна не падыходзіць, настолькі праўдзівы вобраз Таміліна. Жакаў—адзін з нямногіх кінематаграфічных актораў, якога выхаваў толькі кінематограф. Актор атрымаў ад яго самыя лепшыя рэалістычныя традыцыі і яны дапамагаюць яму ствараць вобраз з прадзельнай пластычнай выразнасцю. Тамілін у карціне вельмі скупы на словы, але ўсмешка, погляд, рухі, учынкі гавораць больш за словы, і вобраз даходзіць да гледача ва ўсёй яго паўнаце. Жыццёвая прастата вобраза, якая з такімі вялікімі цяжкасцямі даецца большасці актораў, дапамагла Жакаву ў гэтай карціне ўпрыгожыць і дэдэктыўную аснову сюжэта і зрабіць фільм надзіва пераканаўчым творам мастацтва.

З астатніх актораў трэба адзначыць Дуднікава ў ролі шпіёна Хаджы. З прычыны сюжэтных асаблівасцей. Дуднікаў быў вельмі абмежаваны ў сваіх магчымасцях. Толькі на самалёце ён пачаў дзейнічаць і выразна паказаў драпежнае асперванение ворага, асуджанага на пагібель.

Выдатна зроблены паветраныя здымкі аператарам Віхаравым. Здымкі былі выключна цяжкія і складаныя. На вышыні 5.000 метраў трэба было здымаць самыя адказныя эпізоды фільма. Апрача ўсяго, аператару ўдалося яшчэ засняць велічныя віды вяршалін самых высокіх гор Каўказа і Паміра, сярод якіх разыгрываюцца войстра-драматычныя сцэны фільма.

Удача аператарскіх здымкаў яшчэ больш узнімае глядзельны эфект карціны ў цэлым.

М-ЛАЎ.

ЛЕНІНГРАДСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР ДРАМЫ І КАМЕДЫІ

(К гастролям у Мінску)

Тэатр драмы і камедыі — самы малады ў сям'і ленінградскіх тэатраў. Ён існуе ўсяго паўтара года.

Кіруемы заслужанай артысткай РСФСР ордэнаносцам Н. С. Рашэўскай, гэты тэатр сваёй цэнтральнай творчай задачай лічыць стварэнне спектакляў, у якіх сродкамі мастацтва было-б найбольш поўна адлюстравана складанае маральнае аблічча чалавека новай вялікай эпохі.

Чалавек і яго псіхалогія, яго дзеянні, яго мыслі, яго надзеі, яго радасці, яго пакуты, яго складаны ўнутраны свет, яго дзёрзкія лятуценні — з'яўляюцца невычарпальнай крыніцай творчага наглядання для мастака.

Манументальныя вобразы, гераічныя характары існаваўшых у канкрэтнай гістарычнай рэчаіснасці людзей, самаадданна служыўшых і служачых народу, рэвалюцыі, навукі, — прыцягваюць увагу тэатра, і тэатр у супрацоўніцтве са сваімі творчымі аднадумцамі захапляюча працуе над іх сцэнічным увасабленнем.

Так, спецыяльна па заданню тэатра пісьменніца А. Голубева напісала п'есу аб С. М. Кіраве, пісьменнік Г. Штарм — пра Ламаносава.

Тэатр імкнецца да арганічнага спалучання ў сваім рэпертуары рамантычных спектакляў (такім у першую чаргу павінен з'явіцца ажыццяўляемы зараз спектакль «Кранштадт»), якія натхнёна і страсна апавядаюць пра самыя яркія старонкі барацьбы за ўмацаванне перадавых комуністычных ідэй, апяваюць легендарныя подвігі, праслаўляюць мужнасць,—са спектаклямі, у якіх асаблівая ўвага аддаецца паказу самых тонкіх псіхалагічных нюансаў, якія матывіруюць часамі вельмі складаныя ўзаемаадносіны паміж людзьмі.

Адным з абавязковых патрабаванняў, прад'яўляемых намі актору, з'яўляецца патрабаванне дасканалага валодання рознымі і складанымі жанрамі драматургіі, якімі з'яўляюцца драма і камедыя.

Першым сваім спектаклем—інсцэніроўкай геніяльнага рамана Льва Талстога «Анна Карэніна», які пастаўлен рэжысёрам Леслі і афармлен прафесарам М. П. Бобышэвым і які сыгран з нязменным поспехам больш 250 разоў, тэатр даказаў сваё права на жыццё.

Другая прэм'ера тэатра — п'еса пісьменніка-ордэнаносца К. Паустоўскага «Сузор'е гончых псоў». Гэта п'еса рысуе адзін з эпізодаў барацьбы гераічнага іспанскага народа з інтэрвентамі. Дзея адбываецца ў французскай абсерваторыі, якая знаходзіцца ў гарах на іспанскай тэрыторыі. Вучоныя назіраюць за зоркамі і да іх даходзяць толькі водгукі барацьбы, што ідзе ў далінах. Яны хочуць займацца сваёй навукай, але барацьба ўрываецца ў мірныя сцены абсерваторыі, і перадавыя вучоныя бяруцца за вінтоўкі, каб абараняць радзіму ад захватчыкаў і мракабесаў.

Спектакль атрымаў высокую ацэнку тэатральнай грамадскасці Ленінграда. Ён асабліва цікавы тым, што быў пастаўлен маладымі творчымі работнікамі (рэжысёр В. В. Эрэнберг, мастак Д. Ф. Папоў, якія толькі-што скончылі Акадэмію мастацтваў; музыка кампазітара Ю. В. Свірыдава—вучня Д. Д. Шастаковіча).

Трэцяя прэм'ера—класічная камедыя англійскага пісьменніка XVIII стагоддзя Олівера Гольдсміта «Ноч памылак». У вясёлым ланцугу непаразуменняў, якія адбываюцца з героямі п'есы ў выніку таго, што адзін з персанажаў захацеў пажартаваць з другога, аўтар—адзін з лепшых камедыйных пісьменнікаў мінулага—паказвае быт і норавы сучаснага яму англійскага грамадства, якое захавала некаторыя свае тыповыя рысы аж да нашага часу.

Ставіць гэты спектакль В. Н. Салаўёў—адзін са старэйшых і самых вопытных майстроў рэжысуры. Мастак спектакля А. В. Рыкаў. Музыка В. М. Дзешавога.

Апошняя прэм'ера тэатра—п'еса пісьменніка-ордэнаносца Л. М. Леонава «Воўк».

Чытачам газеты «Літаратура і мастацтва», відавочна, вядома дыскусія, якая разгарнулася вакол гэтай п'есы. Не ўваходзячы ў сутнасць яе, мы лічым толькі патрэбным адзначыць, што адно паяўленне «Воўка» ўжо робіць немагчымым прабыванне ў рэпертуары тэатра такіх антымастацкіх, рамесніцкіх, па сваёй сутнасці, а таму і пазбаўленых усякага паэтычнага пачатку, уласцівага сапраўднаму мастацтву, аднагадзінных п'ес тыпу набіўшых аскоміну «Вочных ставак» і «Генеральных консулаў».

У незвычайна войстрых драматычных сітуацыях разгортваецца драма выкрыцця і ізаляцыі людзей, па-воўчаму ненавідзячых соцыялістычную рэчаіснасць і спрабуючых самымі агіднымі спосабамі — забойствам, дыверсіяй, шкодніцтвам падарваць магутнасць вялікай дзяржавы.

Асноўны канфлікт «Воўка» — сутычка Магдалініна—«хірурга фашызма», чалавека, якім рухае незгасаемая нянавісць да новага свету, з маладым урачом-комуністам Астаевым, — сутычка новага і старога светаў.

Дасканала выпісаныя вобразы, бліскучая мова і дасканалае валоданне складанейшым жанрам літаратуры, якім з'яўляецца драматургія, ставіць п'есу Леонава ў рад выдатных твораў апошніх год.

Спектакль пастаўлен рэжысёрам З. М. Ерухімовічам. Мастак—прафесар В. А. Шэстакоў.


Па звароце з гастролей тэатр пакажа сваю апошнюю работу: «Месяц у вёсцы» Тургенева (пастаноўка заслужанай артысткі РСФСР ордэнаносца Н. С. Рашэўскай, мастак—А. В. Рыкаў).

Правільнасць нашага рашэння звярнуцца да творчасці Тургенева пацвярджаецца тым, «...што творчасць Тургенева мела не толькі мастацкае, але і грамадска-палітычнае значэнне, якое, як мне здаецца, і надавала сапраўды мастацкі бляск яго творам. Калі адняць грамадска-палітычны змест ад твораў Тургенева, то яны не заняль-б такога пачэснага месца ў гісторыі рускай літаратуры» (М. Калінін. «Аб аўладанні марксізмам-ленінізмам работнікамі мастацтваў»).

Побач з таленавітымі акторамі старэйшага пакалення, да якога ў першую чаргу павінны быць аднесены Н. М. Жалезнова. Г. І Альберці, Ю. Т. Чорнаволенка, Ю. Н. Юр'еўскі, М. Н. Самойлава. Г. І. Мураўскі, Д. Ф. Зайцаў, І. Н. Дымкоўская, М. В. Неўражын, глядач здолее пазнаёміцца і з творчасцю адароннай тэатральнай моладзі. У ліку апошняй найбольш ярка выявілі сябе І. Орлоў, М. І. Гехт, З. Дабзнава.

З. ЕРУХІМОВІЧ.
Галоўны рэжысёр Ленінградскага Дзяржаўнага тэатра драмы і камедыі.

Барысаўскі завод імя Молатава добра асвоіў выраб піяніна. Штомесяц выпускаецца 30 складаных інструментаў. **На здымку:** лепшы майстар цэха Б. Міхайловер за праверкай піяніна.
Фотахроніка БЕЛТА.



«Забастоўка грузчыкаў у часе нямецкай акупацыі» — эскіз да карціны маст. А. Кроля для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».
Фота І. Каплінскага.

Алесь Жаўрук

Другу

У гарадку тваім Джавары
Я да ночы праблукаў —
Па развесістым чынары
Саклю друга я шукаў.
Толькі ў сонечным Джавары
Так заведзена відаць, —
Цёмналістыя чынары
На ўсіх вуліцах стаяць.
Я духанщчыка старога
Стаў распытваць на пуці:
Дзе джыгіта мне такога
Чорнабровага знайсці.
Для каторага без спрэчак
І сяброўства — у цяжар.
Хоць за друга
У смертных сечах
Сам устане пад удар.
Усміхнуўшыся вачыма.
Адказаў духаншчык мне:
— «Можа ў клімаце прычына,
Толькі ў нашай старане —
Што ні хлопец — чорнабровы.
Кожны спрэчнік — пашукаць,
Як адзін, у бядзе гатовы
За сябра жыццё аддаць».
Я у пошуках далейшых
Усіх сустрэчных супыняў —
На дзяўчыне прыгажэйшай
Тваю любую шукаў.
Толькі кожны закаханы
Кляўся мне: Хоць свет прайсці. —
Прыгажэй яго каханай
Ва ўсім свеце не знайсці.

Край чароўны! Пры спатканні
Кожны друг табой сагрэт.
У кожнай саклі і духане
Госцю ласка і прывет...
...Нас ад смагі ратавалі
Пад чынарам векавым
Добрым кіслым цынандалі
І такаем агнявым.
Цень заўважыўшы на твары,
Тамада мне так сказаў:
— «Не сумуй, Сандро, за чарай —
Не яго дык нас спаткаў.
Нас таксама галавала
Гэтых гордых гор кальцо.
Нас таксама калыхала
Песня Шотава, кацо».
...Што-ж спрачацца? —.
Праў аратар!
Я ганю туман з павек...

. . . .

Дзе-ж ты, мой меліяратар.
Неспакойны чалавек?
Узмужаўшы, важны, мусіць.
Дзе ты ходзіш? —
Па тайзе.
Ці ў далёкай Беларусі
На тарфах ды на лазе?
Калі так — прашу, Эулі,
Нашу дружбу ўспамяні.
Да старой маёй матулі
У гарадок мой завярні.
Прыгадай згавор даўнейшы
І шукай мой просты дом
Па нявесце прыгажэйшай,
На бярозах пад вакном.

Поспех Яўрэйскага тэатра БССР на Украіне

Гэтымі днямі вярнуўся з гастрольнай паездкі па УССР Яўрэйскі Дзяржаўны тэатр БССР. Тэатр не быў на Украіне дзевяць год (апошняя гастрольная паездка яго па УССР адбылася ў 1930 годзе). Таму перад тэатрам стаяла вялікая задача: паказаць рост калектыва, яго дасягненні за гэты перыяд. Яшчэ больш хвалявала калектыў тое, што ў мінулым годзе ў Одэсе гастраліраваў Маскоўскі Дзяржаўны яўрэйскі тэатр з тым-жа рэпертуарам: «Бар-Кохба», «Суламіф», «Тэўе-малочнік» і інш.

Аднак, ва ўсіх гарадах УССР і, у прыватнасці, у Одэсе спектаклі Яўрэйскага тэатра БССР карысталіся велізарным поспехам. Амаль усе спектаклі прайшлі пры поўных зборах. За час гастролей тэатр даў 67 спектакляў і абслужыў 49.000 гледачоў. Апрача названых п'ес, тэатр паказаў «Менахэм-Мэндл», «Гершэле Острополер», «Лейбке-салдат», «Людзі ў белых халатах». З найбольшым поспехам прайшлі спектаклі «Бар-Кохба», «Суламіф» і «Тэўе-малочнік».

Амаль ва ўсіх гарадах працоўныя УССР наладжвалі калектыву тэатра братнія сустрэчы. На развітанне тэатр атрымаў граматы, водгукі, у якіх адзначаецца вялікая работа тэатра. Мясцовы друк вельмі цёпла адзываўся аб тэатры і адзначыў творчы рост калектыва. Працоўныя Украіны настойліва запрашалі тэатр прыехаць да іх і ў будучым годзе.

У часе гастрольнай паездкі тэатр узмоцнена працаваў над новымі пастаноўкамі, якія будуць паказаны ў надыходзячым сезоне: «Павел Грэкаў» Войцэхава і Ленча і «Мой сын» Гергеля і Літоўскага.

Зараз тэатр знаходзіцца ў адпачынку і ў кастрычніку пачне работу ў Мінску.

Фальклорна-этнаграфічная экспедыцыя Акадэміі Навук БССР у Чавусах

У Чавускім раёне закончыла сваю работу фальклорна-этнаграфічная экспедыцыя Акадэміі навук БССР.

Экспедыцыя ставіла сваёй мэтай сабраць вусную народную творчасць і ўзоры народнага выяўленчага мастацтва (ткацтва, вышыванне).

На фанограф запісана да 70 народных песень. Ад калгасніц арцелі «12 кастрычнік» (в. Нежкаўка) Асінаўскага сельсовета запісаны прыгожыя народныя песні: «Даліна, далінушка», «Краціўка мая» і інш. Ад калгаснікаў арцелі імя Кірава (в. Дзедня) І. Чарткова і П. Галаганава запісаны цікавыя сатырычныя казкі пра паноў і папоў.

Зроблена да 30 зарысовак народнага ткацкага арнаменту і разьбы па дрэву і 100 фотаздымкаў узораў народнага мастацтва.

У калгасе імя Дзяржынскага (в. Доўгі Мох) засняты на кінаплёнку старажытныя народныя танцы «Шастак» і «Гусары».

Цяпер экспедыцыя пачала работу ў Чэрыкаўскім раёне.

НОВЫЯ ЭКСПАНАТЫ ДЛЯ КАРЦІННАЙ ГАЛЕРЭІ

Рашэннем Соўнаркома БССР карціннай галерэі ў Мінску перадаецца дадаткова рад каштоўных карцін і скульптур з гістарычных музеяў. З Мінскага і Віцебскага гістарычных музеяў галерэя атрымае эскіз «Бурлакі» і карціну «Запарожац» Рэпіна, творы Якобі, Рацьені, Башылава, Клевера і інш. З Магілёўскага гістарычнага музея галерэя атрымае карціны Піманенка і Архіпава, з Гомельскага музея-дзевяць карцін Сухадольскага, тры мрамарныя статуі і інш.

Па слядах нашых выступленняў

„У МАГАЗІНЕ“

У нашай газеце ад 11 жніўня была надрукавана заметка аб нізкай якасці мастацкай прадукцыі, прадаваемай магазінам Белізокамбіната. У гэтай заметцы гаварылася таксама пра тое, што паміж Белізокамбінатам і лепшымі беларускімі мастакамі ўсё яшчэ не наладжана творчае супрацоўніцтва.

Дырэкцыя Белізокамбіната і праўленне Саюза савецкіх мастакоў вылучыла камісію для абследвання работы магазіна. Камісія прызнала правільнымі прыведзеныя ў заметцы факты. Па яе прапанове нядобраякасныя скульптурныя і жывапісныя работы зняты з продажу. У прыватнасці, зняты: адзін з партрэтаў работы А. Заборава, копія з карціны І. Дроздова «На Беламорканале», рад скульптурных партрэтаў, атрыманых з Харкава, а таксама рад нядобраякасных панно.

У сваіх вывадах камісія рэкамендуе карэнным чынам перабудаваць работу Белізокамбіната па распаўсюджванню мастацкай прадукцыі: наладзіць распаўсюджванне копій лепшых работ беларускіх мастакоў, а таксама і арыгіналаў, самы магазін перавесці ў новае памяшканне і рэарганізаваць яго ў магазін-салон, дзе-бы беларускія мастакі маглі выстаўляць для агляду свае новыя работы.

Зміцер БЫВАЛЫ

НА ДАРОЗЕ

(Урывак з аднайменнай аповесці)

Ціхая сонечная раніца. Пацеркамі пераліваецца важкая срабрыстая раса — прадвеснік пагоды. Над полем, над балотам, што раскінулася аж да цёмнага, ледзь прыкметнага на краявідзе лесу, вагаюцца шэрыя пялёны густога туману.

Туман да таго густы і важкі, што адыйдзешся на некалькі крокаў і ўжо не бачыш нічога. Стараючыся заглушыць адна другую, спяваюць птушкі. Птушыны спеў то спускаецца аж да самай зямлі, то ўздымаецца высока-высока, у самае паднябессе, і там пераліваецца званочкамі ў блакіце.

Мальцаў доўгі час углядаецца ў траву: шукае дзеркача, які толькі-што спяваў амаль пад нагамі свае хрыпатыя песні. Потым Мальцаў пераводзіць погляд на вузенькую палявую дарожку, адкуль павінны ехаць на работу людзі. На ёй ціха. Толькі птушкі, здаецца, яшчэ больш пасыпаюць сваім спевам знікшую ў густым тумане палоску дарогі.

Сёння Мальцаў устаў досвіткам і да гэтага часу паспеў амаль па самы пояс выкупацца ў расе, робячы з двума хлопцамі разбіўку дарогі. Ён ведаў, што дарога залацістай істужкай прарэжа непраходнае балота, густы лес і з лёгкасцю песні праляціць праз багатыя калгасныя палі аж да самага горада з яго велізарнымі корпусамі, чыгуначнай станцыяй. І таму работа захапляла яго і спорылася ў руках.

Разбіўшы дарогу метраў на чатырыста, адвёўшы кар'еры і вызначыўшы іх колічкамі, Мальцаў з хлопцамі выйшаў на ўзгорак—падсушыцца ля агню. Крыкуючы над лесам, сонца працінала сваімі праменнямі туман, і ён ад гэтага радзеў, узнімаўся ўвысь і развейваўся. Неўзабаве пачалі даносіцца людскія галасы, рэдкае тарахценне калёс, іржанне жарабчыкаў, адстаўшых ад абозу і шукаўшых сваіх матак.

Мальцава на момант ахапіла расчараванне:

— Мала штосьці едзе... Павінна куды больш...—раздасадавана падлічваў ён пад'язджаючых, шукаючы сярод іх знаёмых па ўчарашняму пленуму сельсовета.

Людзі пад'язджалі, спыняліся на ўзгорку, адпускалі коней на росную траву, закурвалі. Сярод прыехаўшых Мальцаў пазнаў вяртлявага Марціна Лагунка, які штосьці ажыўлена апавядаў сабраўшымся вакол яго мужчынам. А ўбачыўшы Мальцава, ён кінуўся яму насустрач з такой самай прыткасцю, з якой завіхаўся дагэтуль каля мужчын.

— Бачыце, таварыш Мальцаў, першымі прыехалі... Комінтэрнаўцы нідзе не падвядуць...

Пры гэтым ён ціхенька ўсміхнуўся і з таямнічым выглядам дадаў:

— Я ўгаварыў мужчын, каб нашы прыехалі першымі і заклалі пачатак дарогі да таго, як сабяруцца з астатніх калгасаў. Ведаеш, мой даражэнькі, прыклад патрэбен.

Надыходзячы разам з Мальцавым да астатніх мужчын, Лагунок хутка адскочыў ад Мальцава і, забегшы яму наперад, здзіўлена развёўшы рукамі і шнырачы сваімі маленькімі вочкамі, засмяяўся:

— Глядзеце на яго, як з рыбы ўсё роўна... Мой даражэнькі, поўна золакам выйшлі на работу?..

Прывітаўшыся з усімі комінтэрнаўцамі, Мальцаў зноў пачаў прыслухоўвацца да гукаў, што далятвалі аднекуль здалёку. Войстры яго слых злавіў дробнае тарахценне калёс і ледзь чутны гоман людскіх галасоў. Ён радасна ўсміхнуўся.

Сонца тым часам збірала рассыпаную за ноч расу. Усё радзейшым рабіўся туман. У напрамку калгаса імя Варашылава над густою шчацінаю жыта падымаліся клубы пылу. З кожнай хвілінай набліжалася тарахценне калёс. А як падводы сталі пад'язджаць бліжэй і ўжо можна было разглядзець твары некаторых людзей, комінтэрнаўцы надзвычай узрадаваліся. Марцін Лагунок выбег на ўзгорак і, махаючы шапкай, закрычаў:

— Варашылаўцы едуць!

— Еду-у-ць! — яшчэ гучней крыкнуў ён, калі ўбачыў на пярэдняй фурманцы свайго аднагодка, брыгадзіра Мацея Чапрука з чырвоным сцягам, прымацаваным да перадка калёс.

З варашылаўцамі прыехаў і старшыня сельсовета Карпаў. Убачыўшы іх здалёк і прывітаўшыся з Мацеем і Карпавым, Марцін хутка падбег да свайго каня. За Марцінам заварушыліся астатнія. Распрагаліся, выпраўлялі на калёсах дошкі, кідалі недакуркі і плюнуўшы ў руку, каб ямчэй было трымаць чаранок лапаты, насыпалі пясок.

Падводы варашылаўцаў размясціліся ў адведзеным для іх кар'еры. Хутка саскочыўшы з калёс і прывітаўшыся з Мальцавым, Карпаў гаспадарчым тонам звярнуўся да комінтэрнаўцаў:

— Дык што гэта, комінтэрнаўцы? Першымі прыехалі, а нешта стаіцё?! Глядзіце, каб ваша першынство не скончылася толькі прыездам. Так, варашылаўцы?

Варашылаўцы дружна адказалі Карпаву, што першынство будзе за імі, дарма, што яны прыехалі апошнімі. За комінтэрнаўцаў адказаў Марцін Лагунок.

— Мы вас чакалі... А зараз сумесна, ды са сцягам—аж гудзець будзе!..

І, тузануўшы за цуглі свайго каня, Марцін першым выехаў ссыпаць пясок. За Лагунком адна за другой пацягнуліся гружаныя зямлёю падводы.

Залацісты пясок уразаўся ў зарослае травою балота. Ад гэтага балота стагнала, чмокала, адступала перад наступаючым конусам пяску. Час-ад-часу грузла ў набраклым пяску раззлаваная возчыкам жывёла. Яе выцягвалі і гэта месца займалі другія падводы, доўжачы ўсё далей і далей дарожны насып.

Доўгай чарадою, як тыя мурашкі, ад кар'ера да балота рухаліся абозы з залацістым пяском. А балота не здавалася. Чым далей прасоўваўся земляны насып, тым больш упарта адстойвала балота свой векавы спакой. Адчэрыўшы сваю чорную бездань, праглытвала яно сотні вазоў пяску, які перамешваўся з нанесеным за стагоддзі пагніўшым лісцем, з адмершымі каранямі моху, асакі, дробнага хмызняку. Ненасытнае балота патрабавала ўсё новых і новых порцый пяску. Гэта яшчэ больш падымала людзей на наступ. Падганяючы адзін другога, з задорыстым гіканнем напіралі яны на балота. Кожнаму нецярпелася хутчэй праразаць гэту дрыгву, і людзі, як-бы згаварыўшыся між сабою, нават парушаючы правілы пабудовы землянога палатна, гналі падводы ў канец насыпу замест адсыпкі пяску слаямі ва ўсю шырыню дарогі. Людзі з розных калгасаў, з розных населішчаў, часам незнаёмыя між сабою, падганялі адзін другога, спаборнічаючы за хутчэйшы зварот падводы, альбо накопку воза. Час-ад-часу такая гонка не абыходзілася і без непрыемнасцей.

Звужаная дарога не ўмяшчала ўсіх падвод. У некаторых возчыкаў абарачваліся вазы альбо грузла, аступіўшыся, жывёла. Тады ўтвараўся затор, наўсцяж усёй дарогі выцягвалася чарга фурманак. Падымаўся шматгалосы крык возчыкаў:

— Хутчэй ты там павáрачвайся! Чагавáрон страляеш! Гэта-ж не ў полі табе!..

Мальцаў з Карпавым, кідаючыся па ўсяму насыпу, кіравалі работай, не дапускаючы стварэння новых затораў.

Ідучы следам за нагружанай пяском падводай, Марцін Лагунок хоць і адчуваў некаторую стомленасць, але нездаволена пазіраў на заходзячае сонца і бурчаў сабе пад нос:

— Глядзі, якая сіла! І ён хвастаў пугай па набракламу пяску. Столькі зямелькі трэ-э ўсыпаць,—ужо ўголас звяртаўся ён да каго-небудзь з возчыкаў.— Ды калі дружна возьмемся... асілім. Дарма, што багна такая... Асілім, мае даражэнькія...

— Вось гэта возік добры. Малайчына,— гаварыў Марцін кожны раз, калі прапускаў паўз сябе поўную грабарку. Ён жмурыў маленькія вочкі, здаволена надзяляў возчыкаў ласкавымі словамі, кракаў каля іх.

— Так-сынок. Старайся, Захарка... Служы прыкладам людзям... Возік у цябе, мой даражэнькі,— багатырскі... стаханаўскі. І конік спрытны, цягучы...

Захар, здаволены ўвагай старога, не без гонару адказваў Марціну:

— Ад вас, дзядзька Марцін, вучымся. Вы і маладога заткніцё за пояс...

— Не сіла ўжо, мой даражэнькі. Годы не тыя. Маладзейшым куды спрытней быў...

— Ды каб усе так, як вы... Не тое, што некаторыя сімулянты... Вось паглядзіце, вунь едзе такі герой. Вось і рабі з ім што хочаш!.. Старая жанчына ў падоле больш перанясе. Што гэта за воз!..

Нібы толькі гэтага і чакаў Марцін і пачынаў хрысціць сімулянта на ўсе лады:

— Нягоднік ты! Ага. Думаеш круцялём і век пражыць!.. Не. Трасца табе ў бок, круцель ты гэтакі!..Хіба не бачыш, як людзі працуюць. А ты баішся, каб не падарвацца... Нягоднік...

— Не чапай ты гультая,—супакойвалі Марціна калгаснікі...

Стагнала, не хацела здавацца балота. І ўсё-ж яно адступала перад дружнымі намаганнямі людзей, перад сілаю разумнай калектыўнай працы.

Магілёў.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка, Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Адказны рэдактар І. Г.

Ул. Галоўлітбела № Р—1251.